# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 18 (2764) Год LIV | Беласток, 3 мая 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)


# Гадзіннік гэтага не скажа


Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА


**Дзесяцёх маладых мужчын з Беласточчыны прыняло ўдзел у трохдзённым конкурсе царкоўнага званення: „Паведамляе, усхваляе, склікае" ў Мужчынскім манастыры Благавешчання Прасвятой Дзевы Марыі ў Супраслі. Быў гэта першы такога роду агляд у Польшчы.**

— Цяпер у нас ёсць гадзіннік і ведаем, калі маем ісці на багаслужбу. Званы азываюцца пераважна паўгадзіны да яе пачатку. Так ёсць нават цяпер, калі ў нас ёсць гадзіннікі; бывае, што забываем, што надыходзіць час набажэнства, малітвы. Гук звана не толькі напамінае пра час, але і пра абавязак малітвы, — сказаў у размове з „Нівай" у час агляду першаіерарх Беластоцка-Гданьскай епархіі архіепіскап Іакаў.

Пры канцы Светлага тыдня сапернічалі паміж сабой званары з прыходаў Беластока, Дубін, Гайнаўкі, Супрасля, Сямятыч і Васількава. Займаюцца яны званеннем ад чатырох да дзесяці гадоў. Званароў да ўдзелу ў конкурсе заяўлялі настаяцелі прыходаў. Конкурсныя змаганні папярэдзіла выступленне дзейнічаючага ад нядаўна мужчынскага хору імя Багдана Анісімовіча пад кіраўніцтвам Марціна Абійскага. Янка Макаль з прыхода Благавешчання Прасвятой Дзевы Марыі ў Супраслі, які займаецца званарскай справай ад васьмі гадоў, тлумачыў „Ніве":

— Званарскае мастацтва ляжыць ва ўмелым адбіванні рытму, на рытмізацыі. Задача звання гэта перш за ўсё скліканне вернікаў на багаслужбу, паведамлянне іх аб найважнейшых момантах літургіі ды выяўлянне велічы Царквы.

Адзначыў:

— Кожнае званенне павінна пачынацца малітвай званара. Чытаецца 18 або 50 псалом. Звоніцца ў час літургіі, адзначаючы заўсёды кожны артыкул „Сімвала веры". Мелодыя мусіць выказваць характар свят, але таксама і духовы стан званара, таму званар павінен быць засяроджаны перш за ўсё на малітве.

Іншы званар дадаў:

— Званенне падзяляецца на трызвон, двухзвон, перазвон, перабор. Усё залежыць ад таго, калі звоніцца; у Пасху іначай, а, напрыклад, у Вялікі пост — іначай.

Ян Ціханюк з беластоцкага прыхода Усіх Святых (звоніць ад шасці гадоў; вучыўся ў расійскіх майстроў):

— Важна, каб званіць з душой і жарсна.

Марцін Ахрымюк з гайнаўскага Свята-Троіцкага прыхода (звоніць ад дзесяці гадоў):

— Тут, на супрасльскіх званах, звоніцца лёгка. Я магу тут нават ногі папрактыкаваць (за вяроўкі, прымацаваныя да васьмі званоў у супрасльскім манастыры цягнецца таксама пры дапамозе педаляў — М. Х.).

Конкурсныя змаганні вёў знаўца царкоўнай тэматыкі, вядомы таксама ў Еўропе журналіст Радыё Беласток Ян Смык:

— Праваслаўны хрысціянін нараджаецца пры гуках звана, вянчаецца пры яго гуках і пры яго гуках развітваюцца з ім. Што цікавае, звон у еўрапейскае праваслаўе прывандраваў з Нямеччыны з Каталіцкага касцёла, а арган прыйшоў у заходні Касцёл з Візантыі. Сваёй каштоўнасці звон набраў толькі ў расійскім праваслаўі. Сёння без звана немагчыма ўявіць сабе Царкву. Ёсць у яго таксама своеасаблівае месца ў царкоўнай архітэктуры. Устаноўлены ён заўсёды збоку, альбо так, як у Супраслі — звон мае свой асобны будынак.

Рэдактар Смык прывёў пры нагодзе легенду:

— Звон, а папраўдзе кветка ў форме званка, які ціхенька званіў, прысніўся манаху святому Паўліну ў VI стагоддзі. Папрасіў ён пасля, каб збудаваць сапраўдны звон з „падвяночкам" і з убудаваным у ім „сэрцам".

У склад конкурснага журы ўваходзілі: супрасльскі епіскап Грыгорый, ігумен Антоній Зінін са Свята-Троіца-Сергіевай лаўры ў Сергіевым Пасадзе (Загорск) ды дырэктар Падляшскай філармоніі і оперы Марцін Налэнч-Несялоўскі, які не скрываў перад нашай газетай:

— Я ў класічнай музыцы не сустрэў дагэтуль, каб званы спалучаліся з аркестрам.

Мы спыталіся, якія крытэрыі дырэктар Налэнч-Несялоўскі прыняў бы пры ацэнцы царкоўных званароў:

— Перш за ўсё мастацкія, значыць, як канкрэтнае выкананне выконваецца ў музычных адносінах (тэмп, фраза). Такія мастацкія фактары ў пэўнай ступені можна прыкласці да гэтых выкананняў. Асобам, якія запрашалі мяне да ўдзелу ў гэтым журы прыгадваю, што ўдзельнічаю ў ім услухваючыся ў музыку не з кананічнага, а якраз з мастацкага боку.

Айцец Антоній Зінін яшчэ да пачатку конкурсу ўзабраўся быў на рамантаваную цяпер супрасльскую званіцу (XVIII ст.; рамонт мае завяршыцца праўдападобна напрыканцы гэтага года) і асабіста „даследаваў" званы:

— Пры невялікіх папраўках можна было б з іх дастаць яшчэ лепшыя гукі.

Згодна з раздзелам XI статута мужчынскіх і жаночых манастыроў Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, „званенне павінна быць згоднае з царкоўнай традыцыяй, меладычнае, малітвеннае, набожнае". Першаіерарх Беластоцка-Гданьскай епархіі архіепіскап Іакаў сказаў нам:

— Ёсць розныя тыпы звання для розных перыядаў у цыкле літургічнага года і паасобных багаслужбаў. З рытмаў і акордаў можна больш адчуць аб чым званы хочуць нам сказаць у даны момант. Дзякуючы рытму і меладычнасці звана можна адчуваць своеасаблівую духоўнасць і набожнасць.

Анджэй Ляхоўскі, дырэктар Падляшскага музея (філіял гэтага Музея, значыць, супрасльскі Музей ікон, быў галоўным арганізатарам агляду) лічыць, што ў будучыні конкурс званароў будзе мець міжнародны ранг. Першую ўзнагароду (дыплом і 2 тыс. зл.) у конкурсе атрымаў Ян Макаль. Дзве другія ўзнагароды (дыплом і тысяча зл.) атрымалі Ян Ціханюк і Павел Шымчук. Рэчавыя ўзнагароды ўдзельнікам фундавала таксама Генеральнае консульства РБ у Беластоку.


## Трэба пачакаць ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Неяк адзін з польскіх змагароў „Салідарнасці" сказаў мне, што ў барацьбе за сваю праўду ім некалі было крыху лягчэй, чым зараз беларускай апазіцыі. Праўду кажучы, мяне вельмі здзівілі ягоныя словы, бо ў Польшчы ў той час было ўведзена ваеннае становішча, чаго няма ў нас сёння. Былі масавыя арышты, дзе чалавека маглі пасадзіць у астрог толькі таму, што на яго пальцах знайшлі сляды друкарскай фарбы...

## Пад боцькамі ☞ 3

Міра ЛУКША

## За Саколкай ☞ 8

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

## Чарнобыльскі боль ☞ 10

www.belmov.org

## Конь і тэлевізар ☞ 12

Ева СЦЕПАНЮК

9 770546 196000

# Трэба пачакаць

Неяк адзін з польскіх змагароў „Салідарнасці" сказаў мне, што ў барацьбе за сваю праўду ім некалі было крыху лягчэй, чым зараз беларускай апазіцыі. Праўду кажучы, мяне вельмі здзівілі ягоныя словы, бо ў Польшчы ў той час было ўведзена ваеннае становішча, чаго няма ў нас сёння. Былі масавыя арышты, дзе чалавека маглі пасадзіць у астрог толькі таму, што на яго пальцах знайшлі сляды друкарскай фарбы. І ад арганізаванага спецслужбамі забойства чалавека не магло ўратаваць нават тое, што ён ксёндз. А на ўсходняй мяжы стаялі гатовыя рушыць на захад савецкія танкі і доўгія лапы Крамля паказвалі тагачаснаму польскаму кіраўніцтву пальцам які наступны крок яно мусіць зрабіць і як жорстка павінна расправіцца з польскай апазіцыяй, каб яна больш ніколі не ўзнікла ў сацыялістычным лагеры.

Таму я папрасіў свайго суразмоўцу ўдакладніць, што ён мае на ўвазе. І той патлумачыў, што, нягледзячы на надзвычай жорсткі пераслед, ім было прасцей па той прычыне, што ў „Салідарнасці" на той момант было нашмат больш аднадумцаў сярод палітыкаў у вольным свеце, чым сёння мае беларуская апазіцыя. Яны былі ў сваіх перакананнях не такія адзінокія. І гэта не таму, што зараз ідэалы беларусаў не такія як тады ў палякаў. А таму, што на месца заходніх палітыкаў таго часу, якімі кіравалі ідэалы свабоды, справядлівасці, дэмакратыі і дапамогі аднадумцам, прыйшлі людзі, якія разглядаюць палітыку як мажлівасць уласнай кар'еры. Таму гэтыя людзі хочуць проста добра зрабіць сваю работу і ім няважна ці яны яе робяць з аднадумцамі па шкале каштоўнасцей і ідэалаў, ці з людзьмі, якія да іх каштоўнасцей не маюць аніякага дачынення.

Вось па гэтай прычыне яны не толькі могуць не падтрымаць ідэалагічна і маральна беларускую апазіцыю, але з лёгкасцю будуць супрацоўнічаць з яе (і як гэта не дзіўна гучыць, і з сваімі) ідэйнымі супраціўнікамі. Асабліва, калі на носе выбары ў Еўрапарламент, і трэба выбаршчыкам і фундатарам паказаць, што ў дачыненнях з Беларуссю ёсць нейкія зрухі. Нават калі іх, гэтых зрухаў, няма. Заўсёды ж можна нешта прыдумаць.

Вось і прыязджае ў Беларусь кіраўнік МЗС Чэхіі Карэл Шварцэнберг і асабіста ўручае кіраўніку беларускай дзяржавы запрашэнне на ўдзел ва ўстаноўчым саміце Усходняга партнёрства, які адбудзецца 7 мая ў Празе. І ўсе намаганні беларускай апазіцыі прывязаць такія прапановы да фактаў выканання беларускімі ўладамі ўмоў, якія паставіў перад ёй Еўрасаюз, праваліліся ў адно імгненне. А кіраўнік беларускай дзяржавы тым часам, выкарыстоўваючы зручны момант і адсутнасць цвёрдай пазіцыі ў еўрапейцаў, у сваім пасланні проста нагадаў звычайным беларусам і еўрапейскім палітыкам хто такія ворагі народа.

А зусім жа нядаўна еўрапейская палітычная эліта збіралася зрабіць усё магчымае, каб дапамагчы паказаць усім народам Еўропы, у тым ліку і беларускаму, якім насамрэч з'яўляецца сённяшні беларускі рэжым. А паказалі толькі тое, якая сёння ёсць еўрапейская палітыка ў цэлым, і еўрапейская палітычная эліта ў прыватнасці. І ўсё гэта дзеля самай высокай мэты — не даць беларусам адарвацца ад еўрапейскай цывілізацыі. Праўда, усе на свеце гэтак жа сама сцвярджалі, што робяць не заўжды добрыя рэчы толькі дзеля высокіх мэт — і Напалеон, і Сталін і душыцель польскай „Салідарнасці" Ярузельскі.

Беларусам някепска было б у Еўропу. Але для гэтага нічога не трэба асабліва мудрыць. Зрабілі б у аднабаковым парадку для іх бязвізавы рэжым, і ўсё тут. Прыезд дзесяці адсоткаў беларусаў у Еўропу заходняя эканоміка неяк пераварыла б. Тым больш, што беларусы даволі працавіты народ. А вось хто тады эканамічна ўтрымліваў бы існы беларускі палітычны рэжым пры ўладзе — пытанне рытарычнае.

Адзінае, што прыемна ўразіла ў гэтай сітуацыі, гэта тое, што беларуская апазіцыя не асабліва напалохалася такога развіцця падзей, якое склала на дадзены момант. Змаганне за праўду прадугледжвае пэўныя расчараванні, але — як казаў адзін мудры філосаф — праўда заўсёды перамагае. Толькі не цяпер, а пасля. Хацелася б, каб цяпер, але, на жаль, яна заўсёды перамагае чамусьці пасля. Але затое заўсёды.

Трэба крыху пачакаць.

**Віктар САЗОНАЎ**

# Паэты маюць крылы

Калі пасля мітусні многіх шэрых дзён, гонкі за кожным днём чалавек нават не задумваецца над творчым сэнсам жыцця, тады раптоўная хвіліна натхнення з'яўляецца дарам часу, месца і надзеяй на адказ на розныя пытанні. Творчасць кожнага паэта — актуальны адказ на думкі, якія яго акружаюць, шукаючы выхаду ў кожнай галіне мастацтва. Цяжка быць уражлівай адзінкай у сучасным акружаючым свеце, асабліва пішучы ў малым асяроддзі і для малой аўдыторыі чытачоў. Зайздрасць журналістаў не мае межаў. Адны пішуць: вось мінуў час, калі пісьменнікаў насілі на руках як святых, другія: і так не варта чытаць, бо што ж малады напіша, яму бракуе вопыту і ведаў. Я кажу адным і другім: разумнікі, напішыце самі, каб вашы часопісы ці кніжкі не былі макулатурай ды туалетнай паперай, але аздаблялі паліцы ў кожнай беластоцкай хаце. Праўда, мінулі часы, калі людзі гарнуліся да кніжак, не было электронных масмедыяў, інтэрнэту, моладзь з вёсак гарнулася да адукацыі, каб знайсці сваю будучыню ў горадзе. Зараз жа моладзь іншая. Не думае пра творчае развіццё, але больш экзістэнцыяльнае. Ужо ў сярэдняй школе думаюць, каб уладкавацца на працу, памагчы сабе ў адукацыі і каб бацькам было лягчэй. І такая запрацаваная моладзь не мае часу, каб цікавіцца якойсьці паэзіяй, бо ў яе свае праблемы, якія самой трэба развязаць.

Смешыць мяне, калі ў інтэрв'ю нейкія журналісты кажуць: „Чатыры гады пасля выхаду „Суботы ў Маліннікаў" ты маўчаў, нідзе не друкаваўся, а тут выдаеш новы зборнік вершаў". І гэта мяне здзіўляе: дзе яны былі, калі сярод некалькіх дэбютаў мінскага „Дзеяслова" я быў у першай тройцы найлепшых аўтараў-дэбютантаў на Беларусі і пра гэта на Беларусі пісалася, але не на Беласточчыне! Або як друкаваўся ў „Дзеяслове", „Калоссі", „Літаратурнай Беларусі" ці штогод у „Тэрмапілах", якія разыходзяцца па еўрапейскіх бібліятэках, якім не чужое беларускае слова. І пра гэта маўчаць. Хаця не люблю шуму вакол маёй асобы і люблю ціха сядзець пад агульнавядомай грушай, але пра некаторыя факты не трэба маўчаць, а нават трэба імі ганарыцца.

Але і ёсць прыемныя акцэнты. Маючы нагоду часта карыстацца інтэрнэтам, прыдумаў я пісаць свой блог. Напачатку нейкія ўспаміны, замалёўкі, а пасля вершы, здымкі, фельетоны ці аўдыёматэрыялы. На пачатку доўгі час ніхто амаль не пісаў каментарыяў і пераставаў я верыць, што хотосьці на маю вэб-старонку заглядае. Потым паявіліся кароткія мілыя каментарыі, прапановы. Менавіта адазвалася да мяне адна дзяўчына з прапановай зрабіць аўтарскую сустрэчу ў сваім гарадку пад Варшавай. Потым нейкая дзяўчынка з-пад Ольштына даслала э-мэйл, у якім звяртаецца з просьбай ці можа мой верш навучыцца на ўрок польскай мовы. Я згаджаюся, а на другі дзень піша яна, што яе настаўніца зацікавілася маім блогам, які знайшла ў інтэрнэце. Пішуць да мяне людзі з усёй Польшчы. Тыдзень да выхаду зборнічка напісала мне студэнтка з Пётркава-Трыбунальскага, віншуючы мяне проста з талентам. Я адазваўся на яе э-мэйл, а яна — таксама маладая паэтэса і ў траўні гэтага года выдае свой першы зборнік. Пачытаўшы яе вершы, я быў у захапленні. Я не думаў, што ёй толькі 21 год, а па вершах меркаваў, што яна старэйшая за мяне. Я таксама выслаў ёй па пошце экземпляр свайго зборніка. І так, каб усіх маіх чытачоў не пакрыўдзіць, выслаў я зборнічкі ў Кракаў, Люблін, Жэшаў, Вроцлаў, Пётркуў-Трыбунальскі, а нават у Мінск і далёкія расійскія гарады — Валгаград, Нарыльск, бо і там жывуць мае чытачы, якія чакаюць маіх новых вершаў. Мой зборнік „Самота дажджу" з'явіўся вельмі выпадкова. Я нават да гэтага не быў прывыклы. Пісаліся вершы, друкаваліся ў розных выданнях, але заўсёды хацелася напісаць штосьці мацнейшае. І каб не тэлефон праф. Галіны Твараповіч і вестка, што знайшоўся спонсар зборнічка, і каб я рыхтаваў вершы, то я нават не думаў бы пра выданне зборнічка. Заўсёды ёсць лепшыя за мяне і я гэтай свядомасцю жыву. Гэтую радасць я перажыў дзякуючы некалькім асобам, якім кажу сваё бясцэннае „Дзякуй!"

**Юрка БУЙНЮК**

**Вачыма еўрапейца**

# Жэнева — Беласток

Пры канцы мінулага тыдня ў Жэневе завяршылася чарговая канферэнцыя Арганізацыі аб'яднаных нацый супраць расізму, расавай дыскрымінацыі, ксенафобіі і звязанай з імі неталерантнасці. Аднагалосна была прынята завяршальная дэкларацыя датычная расізму з заклікам змагацца з неталерантнасцю. У канферэнцыі ўдзельнічалі прадстаўнікі 140 краін; ужо раней праект дэкларацыі адобрыла 190 дзяржаў. Планавалася, што будзе яна прынята ў апошні з пяці дзён канферэнцыі. Аднак было вырашана прагаласаваць яе ўжо ў другі дзень. Як інфармавала адно з прэсавых агенцтваў, існавала апаска, што змест дэкларацыі ў час дыскусіі можа падвергнуцца змяненням. Гэта было звязана з выступленнем ужо ў першы дзень прэзідэнта Ірана Махмуда Ахмадзінеджада. З трыбуны ААН назваў ён Ізраіль „найбольш жорсткім і найбольш расісцкім рэжымам". У час ягонага выступлення прадстаўнікі некаторых дзяржаў у знак пратэсту выйшлі з залы. У сувязі з „прапускамі" датычнымі выказвання іранскага кіраўніка дзяржавы, канферэнцыю байкатавалі ЗША, Аўстралія, Канада, Нямеччына, Італія, Галандыя, Новая Зеландыя, Ізраіль ды Польшча.

— Мы адмовіліся ад удзелу ў канферэнцыі з-за апаскі, што будзе яна выкарыстана як форум для ўсхвалення ідэй, якія не павінны агучвацца, — сказаў прэс-сакратар польскага МЗС Пётр Пашкоўскі.

На маю думку, выказванне прэзідэнта Ахмадзінеджада без сумнення абуральнае, але — хоць не здзіўляе мяне выхад з залы прадстаўнікоў некаторых дзяржаў — усё ж маю сумненні адносна байкатавання ўсяе канферэнцыі. Справа ж была ў клеймаванні генеральна з'яў звязаных з неталерантнасцю ва ўсім свеце, між іншым у г.зв. Заходняй Еўропе. У гэтай апошняй частцы кантынента гэтыя праблемы, незалежна ад дэкларацый, канстытуцыйных запісаў, канвенцый і да г.п. — нярэдка паяўляюцца. Тут прыкладам можа быць Францыя (яе прадстаўнік у час прамовы прэзідэнта Ірана пакінуў залу). Гаворка не толькі аб хваляваннях з нацыянальным ухілам, да якіх нядаўна даходзіла ў гэтай краіне, але больш канкрэтна хоць бы аб антысемітызме, які ўпісваецца таксама ў цяперашнюю іранскую ідэалогію. Былы пасол Ізраіля ў Польшчы Шэвах Вейс пісаў у адной з польскіх газет — *nomen omen* — у час канферэнцыі ў Жэневе: „Сярод дзяржаў, у якіх новы антысемітызм найбольш прыкметны і пагрозлівы — заадно як у яго лева-інтэлектуальнай, так і ў мусульманскай выяве — ёсць, на жаль, Францыя".

Тым часам таксама ў Беластоку, на шчасце зрэдчас, даходзіць да эпізодаў характэрных з'явам неталерантнасці. У апошнія дні да Пасхі на гарадскіх слупах аб'яў (іх распараджальнікам не з'яўляецца гміна) паявілася каля чатырохсот плакатаў Нацыянальнага адраджэння Польшчы (НОП), арганізацыі крайне нацыяналістычнай і антыліберальнай, абвінавачванай у распаўсюджванні фашызму, значную частку членаў якой складаюць скінгеды. Павіслі тыя плакаты з нагоды 75-годдзя ўзнікнення Нацыянальна-радыкальнага лагера (ОНР), аднаго з кодлаў НОП. Назіраючы ад шмат гадоў за дзейнасцю НОП і чытаючы гэты лозунг на публічна даступных беластоцкіх афішных слупах апусціліся ў мяне рукі, тым больш, што я меў у той час у галаве дыскусію на жэнеўскай канферэнцыі.

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

# У Ляўкове пад боцькамі

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

**Славуты дашок над брамай у ляўкоўскую школу, якая ўжо не існуе, кідаецца ў вочы святочным ззяннем свежай светлай драўніны. А якая гонта на ім, якую так доўга шукалі нараўчанскія ўлады на помнік тутэйшага дойлідства! Помнік можа і маленькі, але кожны праходзячы ці праязджаючы гляне на яго з задавальненнем і цікаўнасцю. І з усмешкай не меншай, калі кіне вокам на сцяну былой школы, на якой красуецца стары і справядлівы лозунг даўніны: на фоне айчыннага кшталту — „Nasz wspólny dom". Клякочуць боцькі на буслянцы на коміне школы, якім уладася пракрэацыя. У закутках пад плотам сярод маладой траўкі зноўку буяюць фіялкі. Вясна! А ля ўваходных дзвярэй, ля шчыта ўсходаў, дзе нядаўна стаяла ёлачка — велікоднае дрэўца заквітнела яечкамі. Застаўся *nasz wspólny dom*. Месцамі яшчэ забіты дошкамі.**

— Гэты лозунг, „Nasz wspólny dom", таксама будзе адноўлены. Гэта таксама забытак! — кажа Марк Скамароўскі. Так, той самы, што і сёння заспявае „Колькі ў небе зор", заспеты на ўсходах у „Цэнтр адукацыі «Інтэрнэтная вёска» — адукацыя на адлегласць на вясковай тэрыторыі". Той самы, з-пад Сямятыч, з Боцькаў, які з боцькаўскай падляшскай капэлай выступае не раз на фестывалях беларускай песні і бярэ прызы. Магутны голас магутнага падляшука чутны і ў нараўчанскай ды ляўкоўскай цэрквах, дзе дадаў духу пеўчым, і чуўся быў у Беларусі, дзе ў Дзятлаве Марк быў чатыры гады памочнікам ксяндза. Сам зможа весці ўсю каталіцкую імшу! З'ездзіў быў і з „Нараўчанкамі" на гастролі на Украіну, захапіў там выкананнем песні аўтарства суседа з Сямятыч Язэпа Карпюка „Журавы". А з якою прыемнасцю чуецца ягонае чысценькае славянскае „л" у беларускіх, украінскіх і рускіх песнях, якія яму так даспадобы. А цяпер ягоны калектыў і ён сам будуць мець мастацкае адзенне з Беларусі. Ды адкуль Марк Скамароўскі ўзяўся ў Ляўкове? У гэтым новым цэнтры культуры і навукі? Меў яго ідэю з сябрам.

*Марк Скамароўскі: „Гэта ты мая, зорка ясная..."*

— Паўтара года тут дзейнічаем, па праекце Еўрасаюза. А што тут было з былой школай да таго часу, калі мы ўвайшлі! Дзверы павыломваныя, вокны панішчаныя. Цяпер крыху тут мы паладзілі. Фіранкі ў вокнах, дзверы заўжды адчыненыя. Людзі кажуць: „Хоць святло гарыць, з коміна ідзе дым, глянеш, і — так добра на сэрцы, што школа не прапала"...

*„Наш супольны дом"*

— А як Вы выбралі гэтае месца?

— Выпадкова. Быў я на працэсіі Божага цела ў Нараўцы. Мы свой праект мелі ўжо падрыхтаваны, але не мелі сядзібы. Параіў нам каталіцкі пробашч з Нараўкі. Ксёндз Гжэгаж, паколькі Ляўкова таксама ў яго парафіі, падвёз мяне сюды, паглядзець будынак. Я пабачыў, кажу: „Супер!". Пан войт яшчэ прапанаваў нам будынак у Нараўцы, ды ў горшым стане. І так заснавалі мы тут „інтэрнэтную вёску". Цяпер шыкуюся да кантролю Міністэрства нацыянальнай адукацыі. Найгоршая справа, бо сядзець трэба ў гэтых паперышчах! Няма чаго баяцца, стараюся трымаць з гэтым парадак, каб дакументацыя была бягуча паафармляная. Вяду запіскі: на сёння больш за 1 300 соб наведала наш цэнтр. На Ляўкова гэта вельмі шмат. Штодзень прыходзяць 10-15 асоб. Год функцыянаваў наш цэнтр на еўрасаюзныя сродкі, ад верасня мінулага года — з гміннага бюджэту. З красавіка на пару месцаў зноў дасталі мы крыху еўрасаюзных сродкаў.

Марк даязджае штодзень з Боцькаў, 70 км у адзін бок.

— Збіраюся ў 6 гадзін раніцы. У 8.15 маю аўтобус з Боцькаў, даязджаю ў Бельск, перасядаюся на Гайнаўку... У Ляўкове я ў 11. Цэнтр працуе да 19-й гадзіны. Раніцай дзеці ў школе, дык падыходзіць ім час працы цэнтра. Здараецца начаваць мне ў адным пакоіку. Зімой езджу ў Боцькі штодзень. Там у мяне дом. Зімой у цэнтры палілася дзень і ноч, каб вада не замерзла ў трубах... О, клякочуць буслы! Добры знак! Добрыя тут у Ляўкове людзі, простыя, адкрытыя. Я ўцешыўся, што мяне адобрылі. Усе адзін аднаго ведаюць. Святкуем разам усе святы.

У цэнтры — камп'ютары. Адзінаццаць. Агульны сервер-маці, да якога падключаны ўсе камп'ютары. Апрача таго маецца шматфункцыйная прылада, дзе ёсць сканер, капірка, ксера. Яшчэ быў прывезены за грошы з праекта ўзмацняльны састаў. Ёсць і экран, праектар — усё ціп-топ!

— Усё, што робіцца дзеля грамадства, дзеля яго развою — добры знак, — кажа Марк Скамароўскі, якога ўсё жыццё апіралася на працы з моладдзю, дзецьмі, у культуры. — Я сам незаможны, просты чалавек, для якога найбольшай каштоўнасцю з'яўляецца праца ў супольнасці з людзьмі. Калі штосьці адбываецца ў грамадзе, хоць крыху, гэта добра, гэта рух да лепшага.

— Спачатку мы тут планавалі зрабіць Рэгіянальны цэнтр адукацыі на падставе культурнай спадчыны, захавання тутэйшых каштоўнасцей. Рукадзелля, абычаяў. Хацелі б праводзіць сустрэчы, абучэнні, майстар-класы... Каб захаваць былое, што яшчэ нядаўна было звычайным і каштоўным у кожным доме. У плане мелі мы хлябную гліняную печ, жорны, ткацкі станок. Былі мары. І будзем рэалізаваць. Але ж пакуль яшчэ... не разарвуся... У Нараўчанскай гміне шмат робіцца і цэнтрам культуры ў Нараўцы, і самаўрадавай ляўкоўскай святліцай, што ля керамічнага завода. Працуюць тут людзі душой адданыя культуры.

Марку Скамароўскаму прыйшлося самому брацца за рамонт цэнтра. Бачылі ляўкоўцы, як арудуе пэндзлем на сядзібе і падворку. Мяркуе цяпер, што зрабіць пад уваходнай адноўленай парадная брамай. Праз яе не будуць уязджаць (уезд з правага боку). Можа, нейкі парканік з хворасту, пасадзіць кветкі?.. — Кожны спыняецца перад брамай, дык і ляўкоўскія каровы захочуць зайсці ў парадны ўваход ды паласавацца свежай траўкай, — жартуе Марк Скамароўскі. Не трэба было мяняць смольных слупоў пад дашком, якія жаўцеюць свежай абшыўкай. Будзе і тое старое стаяць сама менш яшчэ сто гадоў! Моцна будавалі калісь! Ды і тое, што цяпер робіцца, трэба планаваць на гады.

*Янка Целушэцкі, Марк Скамароўскі і славуты парадны ўезд у школу*

З Чаромхаўскай гміны

## Урэшце дачакаліся...

Праблемай кузаўцаў была калдобістая гравійка, якая праходзіць побач царквы і спалучае Кузаву з Рэпчычамі. Вернікі скардзіліся, што аўтамабілі ўздымаюць хмары пылу, які пакрывае храм і той звонку брыдка выглядае. Згаданая жвіроўка спалучае Чаромху-Станцыю з вадаёмам, таму гэтай дарогай карыстаюцца не толькі жыхары Кузавы, але і многія

фота Уладзіміра СІДАРУКА

аматары адпачынку з навакольных вёсак. Кляшчэлеўскі самаўрад некалькі год таму праклаў асфальтавае палатно ў Рэпчычы да мяжы гміны, затым завяршэнне будовы дарогі засталося на баку войта Чаромхаўскай гміны. І нарэшце дачакаліся. Напярэдадні Вялікадня было пракладзена асфальтавае палатно з Кузавы ў Рэпчычы. Дарога шыкарна абкапаная, пракладзены вадасцёкавыя трубы і зроблены праезды на кожны ўчастак поля. Вырашылася затым і праблема абязводжання дарогі, якая вядзе ў напрамку могільніка, за што клапаціліся ўдзельнікі сёлетняга вясковага сходу ў Кузаве. Чаромхаўскі і павятовы самаўрады станоўча паставіліся да выбарчых абяцанак і асфальтавалі дарогу да вадасховішча. Каб гэта толькі не была адзіная ластаўка ў чаромхаўскіх інвестыцыях.

## Мадэрнізацыя электрычнай лініі

У красавіку пачалася мадэрнізацыя электрычнай лініі ў Чаромхаўскай гміне. Выканаўцам з'яўляецца варшаўская фірма. Электраманцёры акуратна ставяцца да службовых абавязкаў. Работы праводзяцца хутка і спраўна, што дазваляе кіраўніцтву будовы па меры магчымасці абмяжоўваць выключэнні току ў час працы. А робіцца гэта дзеля таго, каб не прыбавіць лішніх клопатаў лакальнай грамадскасці пры карыстанні бытавой тэхнікай (халадзільнікі, пральныя машыны, тэлевізары і г.д.). За гэта работнікам фірмы належыцца сардэчная падзяка і словы пашаны. Можна спадзявацца, што згаданая мадэрнізацыя паўплывае ў будучыні на абмежаванне выключэнняў току па прычыне аварыі ў час ураганаў і мяцеліц, што дагэтуль было кашмарам. **(ус)**

## СПАЧУВАННІ

Спадарыні Марыі Луба
і яе родным
словы спачування
з прычыны
сустрэўшага іх гора
смерці маці

выказваюць: „Ніва", Беларускі Саюз, Беларускае гістарычнае таварыства, Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь.

# Перш за ўсё інвестыцыі

*Размова з войтам Арлянскай гміны Пётрам СЭЛЬВЕСЮКОМ, які быў выбраны на гэтую пасаду 2,5 года назад ад выбарчага камітэта „Бельская кааліцыя".*

*(працяг з 17 н-ра)*

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

***— Інвестар з замежным капіталам хоча збудаваць у Вашай гміне дзве ветравыя электрастанцыі. На якім этапе рэалізацыя гэтай задумы?***

— Прадпрыемства з замежным капіталам „Nordex" рашылася збудаваць у нашай гміне дзве ветравыя фермы. Адна мае быць распаложана паміж Спічкамі і Тапчыкаламі, а другая паміж Шчытамі і Крывятычамі. З выкарыстаннем ветракоў будуць яны пераўтвараць сілу ветру ў электраэнергію, якую, згодна з польскімі законамі, будуць прадаваць энергетычнаму прадпрыемству. Прадпрыемства „Nordex" узяло ўжо сельскагаспадарчае поле ад нашых гаспадароў у арэнду, а наш юрыдычны дарадца правяраў гэтыя дамовы перад падпісаннем. Пад будову ветракоў будуць выкарыстоўвацца толькі выдзеленыя часткі дзялянак, а іншыя іх часткі будуць надалей выкарыстоўвацца для сельскагаспадарчых мэт. Зараз мы распрацоўваем план упарадкавання тэрыторыяў, на якіх маюць быць збудаваныя электрастанцыі. Зроблены ўжо памер сілы вятроў на тэрыторыях, дзе будуць збудаваныя ветракі і яны дазваляюць рэалізаваць новую інвестыцыю.

***— Ці можна разлічваць на хуткае завяршэнне інвестыцыйных работ?***

— Прадугледжваецца, што першыя ветракі будуць прадукаваць электраэнергію ўжо ў 2011 годзе, а цэлая інвестыцыя, дзе найдаражэйшымі будуць ветравыя турбіны, кабелі і даязныя дарогі, мае каштаваць 53 мільёны еўра.

***— Калі будзе рэалізавацца такая дарагая інвестыцыя, гмінны бюджэт ад яе таксама павінен атрымаць заўважальны падатак.***

— Мы спадзяемся, што пасля заканчэння ўсёй ветравой інвестыцыі мы будзем атрымліваць ад яе каля аднаго мільёна злотых падатку ў год. Гэта вельмі многа, калі зараз на ўсе інвестыцыі ў сярэднім мы з гміннага бюджэту выдаткоўваем каля аднаго мільёна злотых.

***— Як удаецца Вам рэалізаваць перадвыбарчую праграму і сцягваць вонкавыя сродкі на гмінныя інвестыцыі?***

— За апошнія два гады ўдавалася нам прыдбаць каля мільёна злотых вонкавых грошай у год на інвестыцыі, рэалізаваныя на тэрыторыі нашай гміны. Сярод вонкавых сродкаў было многа грошай з павятовага бюджэту, якія выдаткоўваліся ў нашай гміне на мадэрнізацыю павятовых дарог. Удалося нам такім спосабам перабудаваць дарогу ў Градалях, дарогі да вёсак Пашкоўшчына, Тапчыкалы, Кошкі, Рудуты і вуліцу Бельскую ў Орлі. Мы найчасцей дакладвалі да гэтых інвестыцый 50% іх вартасці грашамі з гміннага бюджэту.

***— Па-за сродкамі з Бельскага павета Вы здабывалі таксама грошы з іншых крыніц.***

— Сама будова тратуараў пры краёвай дарозе ў Малінніках каштавала каля мільёна злотых і мы ўсе грошы на гэтую інвестыцыю атрымалі з Управы краёвых дарог і аўтастрад. Атрымлівалі таксама меншыя грошы з іншых крыніц. Напрыклад, прыдбалі 40 тысяч злотых з Дзяржаўнага фонду рэабілітацыі інвалідаў на дафінансаванне куплі машыны „Опель-Зефіра", да якога далажылі 18 тысяч уласных грошай. Атрымалі 25 тысяч злотых на абсталяванне камп'ютарнага цэнтра ў памяшканнях Добраахвотнай пажарнай каманды ў Орлі. Атрымлівалі таксама сродкі з Маршалкоўскай установы і Еўрарэгіёна „Белавежская пушча" ці Ваяводскай установы, як дафінансаванне рэалізацыі розных меншых праектаў.

***— Вы на працягу апошняга тэрміну рэалізавалі таксама многа інвестыцый толькі за грошы з гміннага бюджэту.***

— У 2007 і 2008 гадах на тэрыторыі нашай гміны мы рэалізавалі інвестыцыйныя і рамонтныя задачы на суму звыш 4,6 мільёна злотых. Разам мы перабудавалі звыш 9 кіламетраў дарог, выканалі каля 1700 метраў каналізацыйнай сеткі, адрамантавалі 8 святліц і ва ўсіх мясцовасцях мадэрнізавалі вулічнае асвятленне. Калі гаварыць пра 2008 год, дык на тэрыторыі нашай гміны мы выдаткавалі на інфраструктуру сродкі параўнальныя да 35% цэлага нашага гміннага бюджэту, што нашу гміну ставіць сярод самых лепшых гмін у нашым ваяводстве, калі гаварыць пра выкарыстанне інвестыцыйных магчымасцей. Сярод гэтых праектаў частку дарожных і іншых інвестыцый мы рэалізавалі толькі за сродкі з гміннага бюджэту.

***— У час апошняга перапісу насельніцтва прыблізна 70% жыхароў Арлянскай гміны дэкларавала сябе беларусамі. Якія беларускія мерапрыемствы ладзіце на тэрыторыі гміны?***

— Кожны фэст у нашай гміне — гэта беларускі фэст. Амаль два гады назад мы з беларускім фэстам спалучылі святкаванні 500-годдзя Орлі, а ў мінулым годзе беларускі фэст прымеркаваны быў да 85-годдзя дзейнасці Добраахвотнай пажарнай аховы ў Орлі. Беларускія фэсты ў Крывятычах спалучаны са „Спасаўскімі запустамі", фэсты ў Рудутах ладзяцца ў рамках фестывалю „Там по маёвуй росі". Арганізавалі мы таксама беларускія фэсты ў Малінніках.

***— У Вашай гміне дзейнічаюць таксама беларускія калектывы.***

— Мы дапамагаем народным калектывам „Арляне" і „Малінкі", маладзёжнаму калектыву „Фермата" і двум дзіцячым калектывам, што дзейнічаюць і ў школе, і пры Гмінным асяродку культуры. Усе нашы калектывы спяваюць па-беларуску.

***— Як гмінная ўстанова дапамагае школе ў арганізаванні беларускіх мерапрыемстваў?***

— Калі ў школе ладзяцца беларускія мерапрыемствы, мы дапамагаем ім фінансава і арганізацыйна.

***— Якія ў Вас планы далейшага развіцця гміны?***

— Распачаўся працэс адраджэння нашай гміны. Відаць гэта на прыкладзе інвестыцый, рэалізаваных гміннай установай для дабра нашых жыхароў і на прыкладзе двух вялікіх інвестараў, якія плануюць інвеставаць у нас каля 400 мільёнаў еўра. Яны павінны пацягнуць за сабой іншых інвестараў і спрычыніцца да развіцця нашай гміны і цэлага рэгіёна. Я, як войт, хацеў бы, каб як найбольш грошай з падаткаў было інвеставаных у тэхнічную, культурную і турыстычную інфраструктуру. Планы на будучыню гэта будова вадасховішча і новага будынка для Гміннага асяродка культуры. Прадбачваем, што вадасховішча будзе збудаванае на Арлянцы, але яшчэ не вырашана з якога боку Орлі. Аднак лічым, што на сённяшнім інвестыцыйным этапе самая важная — будова дарог.

***— Дзякую за размову.***

**Гутарыў Аляксей МАРОЗ**

# Ходзіць самота па Ляўкове

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

**Ніну Матысюк ведаюць у Ляўкове, здаецца, усе. І Новае, і Старое Ляўкова гэта невялікія вёскі, а ў такіх месцах усе сабе суседзямі. Непасрэдныя кантакты здараюцца кожнага дня, амаль кожнаму. Таксама і спадарыні Ніне, хаця яна стараецца пазбягаць сустрэчаў з іншымі жыхарамі.**

— Хаджу так, — кажа спадарыня Ніна, — збіраю амялу, прадам пасля. Каб падзарабіць. А што ж мне рабіць, жыць цяжка.

Гэтыя словы паўтараліся часта ў размове са спадарыняй Нінай. Неяк не здзіўлялі мяне. Бо вядома як зараз на такіх вёсках жывецца. У Ляўкове трымае людзей яшчэ цагельня. Сапраўдны завод, які дае працу, а шмат каму надзею: не толькі на заробак, але і звычайнае спадзяванне, што будзе лепш. Часта чуецца ад людзей, што такі час прыйшоў, што кожны можа знайсці занятак, але калі заглянуць на панадворкі і ў вясковыя хаты — аказваецца, што калі даволі маладыя застаюцца беспрацоўнымі, там у сям'і часта гасцююць бяда і гарэлка. У выпадку пані Ніны прыйшлі аднак няспадзяваныя выклікі ад лёсу, з якім справіцца ёй было вельмі цяжка. Сёння цярпенне расце.

Недзе ў палове дзевяностых гадоў спадарыня Ніна перайшла на рэнту. Раней працавала ў цагельні, хочацца сказаць: „як усе". Разам з працай кончыўся штодзённы, добра вядомы рытм дня, скончыліся таксама грошы, якія дазвалялі жыць на мінімальным, але прыстойным узроўні жыцця. Праблемай хутка стала тое, што мусіла ўтрымлівацца самастойна, бо раней Бог забраў палову ейнай сям'і. Засталася яна адна з дачкой. Каб хоць жылі супольна з дачкою!

— Яна пайшла замуж, але за гарэлку, — кажа з жалем пані Ніна. Круціць галавою, быццам не разумее, чаму якраз ёй лёс прынёс такія выпрабаванні.

Не засталася Ніна, аднак, зусім адна. Пра яе праблемы занесла свету жыхарка Ляўкова, спадарыня Бажэна Пякарская, якая не можа зразумець, чаму такім людзям у Польшчы няма дапамогі. Сваю ўражлівасць падзяляе з пляменніцай Ніны Матысюк.

— Цёці трэба неяк дапамагчы, хаця б пагасіць даўгі, — распавядае Бажэна са слязамі ў вачах.

Цёцін лёс вельмі яе турбуе, можа нават больш чым яе роднай сястры.

— Але яна таксама не мае лёгка, — уздыхнуўшы, кажа нашая гераіня. — Добра, што Мажэну (пляменніцу) прынялі на працу, будзе ім неяк у жыцці зручней. Пакінуў яе муж, сама не працуе, у дачцэ надзея...

Самотная жанчына, вандруючая цэлымі днямі па ваколіцы, сям'я, якая не вельмі ведае як дапамагчы, да таго яшчэ — той доўг.

— Ён налічвае ўжо больш за чатыры тысячы, — паведамляюць жанчыны. Ніне пагражае высяленне.

З эксмісіяй аднак не такая простая справа. У дзевяностыя гады Ніна Матысюк выкупіла сваю кватэру. Зараз гэтыя памяшканні вартыя напэўна не менш за дваццаць тысяч залатовак, значыцца, нельга эксмітаваць жанчыну з яе кватэры, пакуль доўг не дойдзе прынамсі да вартасці ўсяе нерухомасці. Пацвярджаюць гэта і працаўнікі жыллёвага кааператыва. Таму немагчыма, каб нехта паслаў пісьмо з пагрозай эксмісіі. На пытанне пра такі факт спадарыня Ніна маўчыць.

— Кепска вам там жыць? — пытаюся, разгубленая.

— Я ўжо шукаю новага жылля, — адказвае, абмінаючы пытанне, жанчына. — Знайшла такую кватэрку, але ў Чаромсе. Ведаеце, гэта далёка.

— Але ж маеце сваё месца ў Ляўкове...

— Пыталася таксама ў гміне, ці ёсць нейкія памяшканні, але ўсё кажуць, што няма.

Войт пацвердзіў, што пакуль няма што разлічваць на такое, але ў гэтым выпадку яно непатрэбнае.

— Ёсць іншая прычына, праўда?

— Цяжка мне жывецца, — адказвае пані Ніна, як бы сама сабе.

Пакуль сама раскрыла гэтыя ўзгаданыя цяжкасці, на праблему накіравалі самі жыхары Ляўкова.

— Зносіць яна ўсялякае смецце на кватэру, — кажа адзін з іх.

— Сварыцца з суседзямі ўвесь час, за што, не знаю, — кажа другі.

Самі суседзі скардзяцца на заліванне сваёй кватэры, якую не так даўно рамантавалі.

— А што мне рабіць з гэтым кранам, што цячэ, — наракае спадарыня Ніна. — Я не ўмею гэтага паладзіць.

Мне затое цяжка зразумець, чаму ніхто не загляне да Ніны і не спытаецца, ці дапамагчы ў нечым, ці нешта паладзіць. Каго не спытаеш у Ляўкове ці ў суседніх вёсках, кажуць, што жанчына стала.... „дзікая". Абмінае ўсіх, не хоча з нікім гаварыць, амаль хаваецца ад людзей. Калі з другога боку няма адкрытасці, а толькі ціск, цяжка спадзявацца нейкага зразумення.

— Я хачу знайсці іншую кватэру, бо не магу дагаварыцца з суседзямі, — урэшце пані Ніна прызнаецца сама. — Што я параджу на ўсё тое. Сама не дам рады, ані сплаціць доўг, ані справіцца са старой кватэрай.

— У цёці пяцьсот з нечым гэтай рэнты, — кажа Мажэна. — Няма з чаго тут пагасіць гэты доўг.

— Я яшчэ мусіла ўзяць пазыку і таксама мушу яе плаціць, — дадае Ніна Матысюк. — Каб яшчэ нас двое было, а я — адна!

Месячны кошт за кватэру і ўсе іншыя аплаты перавышае трыста злотых. Раней спадарыня Ніна атрымлівала даплату да кватэры, але калі пачаў расці доўг, спынілі ёй гэтую дапамогу. Такі закон. Калі глянуць збоку на ўсю справу, то можа здавацца, што тут не зусім трагічна. У жанчыны ёсць жыллё, ёсць і сям'я, якая бачыць праблемы, але можа і дапаможа справіцца прынамсі з часткай. Кааператыў разумее, што трэба тут нешта вырашыць, знайсці выхад з сітуацыі, які не пакрыўдзіць перш за ўсё паню Ніну. Толькі рашаць. Толькі ніхто пакуль за гэта не бярэцца. Ніна Матысюк мае сваю волю, але, здаецца, здаўна жыве ў сваім свеце, у які нялёгка ўвайсці. Відаць, давярае сваёй пляменніцы. Можа, якраз яна павінна паспрабаваць знайсці дарогу да сэрца цёці, якое амаль спынілася разам з трагедыямі, што азмрочылі ейнае жыццё. Такім людзям перш за ўсё патрэбныя вочы і вушы, патрэбны праваднік па сучасным свеце.

## Як змагацца з п'янствам вадзіцеляў?

Шчыра кажучы, надаела мне ўжо гадамі слухаць гэтых самых заклікаў аб цвярозасці шафёраў і напышлівых заяў аб рашучым — і гэтым разам паспяховым — змаганні з гэтай адмоўнай з'явай. І вось што атрымліваецца: падчас каталіцкіх велікодных святаў, за чатыры дні паліцыянты „выявілі" ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ п'яных вадзіцеляў. І што будзе за гэта патэнцыяльным бандытам на шашы? Значнай частцы нічога, апрача штрафных пунктаў. Іншым на год забяруць вадзіцельскія правы і прыйдзецца ім заплаціць „строгі" штраф. І гэта ўсё. Аж да чарговай нагоды.

Складваецца ўражанне, што ў Польшчы ніхто не хоча па-сапраўднаму змагацца з п'янымі вадзіцелямі. А спосаб на іх вельмі просты. Вядома, што вадзіцельскія правы даюцца падобна даросламу чалавеку. А дарослась — гэта між іншым і адказнасць за ўчынкі. Калі хто ў п'яным відзе сядае за руль — хаця добра ведае, што гэта злачынства — то свядома дае доказ сваёй няспеласці і грэблівага стаўлення да законаў, ствараючы такім чынам пагрозу жыццю і маёмасці ўдзельнікаў дарожнага руху. І такі злачынца павінен быць пазбаўлены вадзіцельскіх правоў **назаўсёды**, каб такім чынам выключыць яго з ліку карыстальнікаў дарогі. Да таго трэба яго так аштрафаваць, каб паслядоўнасці гэтай кары доўга і балюча адчувала ягоная сям'я. І гэта ўсё.

Я **ўпэўнены**, што пасля 2-3 месяцаў **безагаворачнага** прымянення такіх рэпрэсіўных мер у час чарговых святаў паліцыя зловіць ужо толькі дваццаць п'яніц за рулём, а не дзве тысячы як сёлета. Толькі нехта ў Польшчы сапраўды павінен быць зацікаўлены ў вывядзенні п'янства сярод шафёраў. А пакуль што нікога такога не відаць...

**М. Ц.**

## Праўда на дарозе

Ужо мінула два гады ад таго часу, як я пайшоў шукаць праўду ў войта Нарваўскай гміны Якуба Садоўскага. Завялі мы былі гутарку аб рамонце павятовай дарогі з вёскі Бялкі праз Агароднікі ў вёску Іванкі. Войт мне сказаў, што ў 2008 годзе не будзе рамонту згаданай дарогі, ды ён з гміннага бюджэту выдзеліць грошы на апрацоўку планаў пабудовы дарогі, а павет пачне работу ў 2009 годзе і ў гэтым годзе закончыць. Ну, думаю, я тут хоць за чацвёртым разам знайшоў праўду! А войт што сказаў, дык стрымаў слова — з ранняй вясны пачалі некалькі раз мераць дарогу і рабіць планы. Ды аказалася цяпер, што Гайнаўскі павет не стрымаў слова і грошы на абяцаную дарогу з Бялкоў праз Агароднікі да вёскі Іванкі перакінуць на Белавежскую гміну, бо там у пушчанскіх нетрах цяжка хадзіць дзікам, ваўкам і зубрам і для іх, вось, патрэбныя асфальтаваныя сцяжынкі! А ж павятовы радны ад Нарваўскай гміны Сцяпан Кучынскі адзін не ў змозе пераканаць усіх павятовых радных у тым, што ў Нарваўскай гміне знаходзіцца найбольш павятовых дарог і яны наймарнейшыя ва ўсім павеце! Бачыце, грошы на дарогі ў Нарваўскай гміне перадаў староста на Белавежскую. Дык што, ці тая наша праўда згарэла? Дык нашто мы, дурні, за яе змагаліся?..

**Мікалай ЛУК'ЯНЮК**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

# зорка

для дзяцей і моладзі

# Рыбалы: беларуская мова ў клубе

На тэатральным аглядзе ў Беластоку

Мы глядзім на дэкламатараў і мімавольна думаем пра іх настаўнікаў, школу. Часам гэтыя справы не супадаюць з прынятай схемай. На беларускія конкурсы прыязджаюць дзеці, якія не вывучаюць роднай мовы ў школе. Напрыклад, дзеткі і моладзь з Рыбалаў. З часу, калі там закрылі школу, звялася і родная мова. Ну, не зусім... Яна жыве ў вясковым клубе. Здаецца, не было ў нас конкурсу, каб у ім не ўдзельнічалі рыбалаўскія дзеці. Яны, у прынцыпе, не розняцца ад сяброў з Чыжоў ці Залук. Прыстойна выступаюць на сцэне, часта бяруць прэстыжня ўзнагароды.

— Як вам такое ўдаецца? — пытаем у Лідзіі Мартынюк — кіраўнічкі, інструктара, апякункі. Пані Лідка не ўяўляе сабе жыцця без дзяцей. Для іх патрапіць прыдумаць танец, зрабіць любую ляльку-героя для лялечнага тэатра, напісаць сцэнарый... Яе праца і дзейнасць не месцяцца ў прынятых рамках. Ёй часта прыходзіцца быць нянькай для малеч і старэйшай сяброўкай для дарастаючых дзяўчат...

На „Роднае слова" яна прывезла дэкламатараў на сваёй машыне. А пасля ўсіх трэба было паразвозіць па вёсках і хутарах, каб для ўсіх астаўся добры ўспамін пра беларускі конкурс. Пані Лідка ніколі не рабіла праектаў „пад беларускасць". Родная мова для яе — грунт, на якім трэба выхоўваць маладое пакаленне. Праўда, усяк бывае ў жыцці, але звычайна добрыя памкненні і ідэі перамагаюць, будуюць атмасферу і масты ў вясковым, закрытым грамадстве.

Юстына Давідзюк

— На мае заняткі прыходзяць таксама каталікі, — адзначае пані Лідка. — Яны спяваюць нашы песні, выступаюць у беларускіх п'есах. А мне прыемна, калі іх бацькі адабраюць такі выбар, прыходзяць на спектаклі, глядзяць, весяляцца з іншымі...

Нам таксама прыемна, што сябры з Рыбалаў не здаюцца і прымаюць удзел у беларускіх конкурсах.

**ЗОРКА**

# Дзічка

Блукаючы на паляванні па восеньскіх лясах, шмат разоў частаваўся я пладамі дзічак — яблынь альбо груш. Галоднаму, яны здаваліся даволі смачнымі — асабліва познія, крышку падгніўшыя грушкі. Я трос дрэўца, з яго ляцелі пераспелыя плады, разбіваючыся аб мае плечукі. Іншы раз прыносіў грушкі дамашнім у якасці зайчыкавага гасцінца.

Ствалы дзічак крывыя, галінкі калючыя, гэткія ўжо недатыкі! Але ж як шчодра аддаюць свой сціплы ўраджай лясным жыхарам. Іх плады — сапраўдны ласунак для вожыкаў, казуль, дзікоў.

А вось яна, дзічка! Бачыш, лісцейка дробненькае, уся нейкая палахліва-трапяткая. Мне яна нагадвае заплаканую дзяўчынку, што з-пад ілба зіркае на крыўдзіцеля.

Нямала ў лесе яблынь, груш, вішань ды сліў, што выпадкова пасадзіў чалавек. Кінуў ён асяродак яблыка ці карэньчык вішні — а з іх і прараслі дрэўцы. Вось табе і дзічкі. Сяўцамі з'яўляюцца не толькі людзі, але птушкі і звяры.

Мой сябар Мікола Канаплянік — вялікі знаўца саду. Ён прышчапляе галінкі самых розных сартоў яблынь ці груш на дзічкі прама ў лесе. А праз год перасаджвае ў сад ці даруе знаёмым. Дзічка — дрэўца выноснівае, прагнае да жыцця. Яно становіцца добрай мацеркай для прывітых галінак.

**Хведар ГУРЫНОВІЧ**

Кацярына Федаровіч, 12 гадоў. З'яўленне цудатворнай іконы Маці Божай Жыровіцкай. Папера

Максім ЛУЖАНІН

## Дождж

Нечаканы, буйны, зразу,
Сек упоперак і ўдоўж.
Па платах, па пералазах
Бег упарты, спорны дождж.

І рака дыхнула вольна
Паднялася, паплыла.
У дубоў па чорным голлі
Кроплі падалі з чала.

Заблішчала сіняй пражай
Маладая збажына.
Вось цяпер ніхто не скажа,
Што спазнілася вясна.

# Зося з першага „а” класа

— 28 —

Аднойчы Зося сустрэла на вуліцы сяброўку з пачатковай школы, Ксеню Марцінкевіч. Дзяўчаты ледзь пазналі адна адну, яны надта змяніліся ад апошняй сустрэчы. Зося мела выгляд маладой інтэлектуалкі, Ксеня бачылася як каларытная мастачка. Неўзабаве Зося даведалася адкуль Ксеня натхнілася новым стылем.

— Мае бацькі думаюць, што я буду архітэктарам, — сказала Ксеня, — але я мару пра маляванне.

— Ведаю асобы з падобнай праблемай, — сказала Зося. — Мая сяброўка паступіла ў юрыдычны клас, бо ў яе бацькі — юрысты. Яна, паводле іх, таксама павінна быць адвакатам.

— А ты ў якім, Зося, класе? — спыталася Ксеня.

— У матэматычна-фізічным...

— О! Ты мне вельмі спатрэбішся, — уцешылася дзяўчына. — Шукаю асобу, якая дапаможа мне па матэматыцы. Мушу дакладна вывучыць гэты прадмет, калі мае з мяне атрымацца архітэктар...

— Ну, добра, — сказала Зося. — Але пасля, у падзяцы, ты запраектуеш мне хату!

— Няма праблемы! Хоць асцерагаю — яна можа заваліцца!

Дзяўчаты сталі смяяцца з будучай хаты Зосі. У далейшай размове Ксеня сцвердзіла, што яе сяброўка больш чым з выгляду памянялася па характары. Адчувалася, што Зося вучыцца ў мужчынскім класе, таму што ў яе памяняліся зацікаўленні.

— Ну, а якія ў цябе планы на будучыню?

— Мабыць, стану студэнткай Політэхнічнага інстытута, — сказала Зося. — Хоць, ад нейкага часу я пачала цікавіцца гісторыяй.

— А хто з'яўляецца тваім настаўнікам?

Зося не хацела расказваць пра Іванюка, бо ён меў нестандартныя адносіны да прадмета. Часта замест заахвочваць вучняў, ён адпіхаў. Калі ўрэшце назвала прозвішча, Ксеня вельмі ўцешылася:

— У нас супольны настаўнік! Іванюк будзе весці ў мяне рэпетыцыі па гісторыі мастацтва. Гэты прадмет спатрэбіцца будучаму архітэктару.

Зося не ведала, што сказаць. Прадчувала, што пасля першага ўрока з Іванюком Ксеня Марцінкевіч памяняе планы на будучыню!

wodortlenek92@wp.pl
majeszkarowu@tlen.pl

# Музыка з кайфам

## Байкеры і музыка

Не ад сёння вядома, што няма гульні без музыкі, ці гэта дзень нараджэння пяцігадовага дзіцяці, ці баль школьнікаў, запусты, імяніны ды падобныя мерапрыемствы. Не ведаю ці з музыкай вам асацыюецца злёт матацыклістаў, але падкажу, што ніводзін з іх не ўяўляе такой сустрэчы без музыкі. А калі адкрываецца ці закрываецца байкерскі сезон, тады неабходна ладзіць вялікія канцэрты на прыродзе. Найбольшыя ў Беларусі праводзяцца пад Мінскам, у Брэсце і пад Гроднам. Гэты апошні сёлета прайшоў на мінулых выхадных і быў сапраўды нечаканасцю, бо да апошняга моманту ўлады не дазвалялі яго правесці. Удалося!

фота Ілоны Карпюк

Гродзенскі фэст байкераў прайшоў пад назвай „Хавайся ў бульбу”. Зразумела, тады на сцэне не мог адсутнічаць гурт „Крама”, які адмыслова прыехаў з Мінска. Побач крамаўцаў у турбазе „Купалінка” выступілі і іншыя мінчукі, не толькі на матацыклах. Зайгралі „Нака”, „Без білета”, „Адыс Абэба” ці „Нейра Дзюбель”. Вітаць сезон прыехалі музыкі з Брэста, Ваўкавыска, Ліды і Гродна. Мэтай мерапрыемства былі не толькі гульня і сустрэча, але таксама дзейнасць харытатыўнага кшталту, бо арганізатары збіралі грошы на дзіцячы дом у Лідзе.

Такія фэсты гэта свята добрага настрою. Пару разоў прыйшлося мне пабываць на такога роду мерапрыемствах у турбазах на Мінскім возеры, куды з'язджаліся матацыклісты з усёй Беларусі, Польшчы, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі, а нават і Канады. Байкеры, і тыя аб'яднаныя ў клубах, і тыя, якія ездзяць для прыемнасці сустрэчы са светам і прыродай, гэта каляровыя людзі, сучасныя хіпі. Таму варта трапіць на іхняе свята, каб паслухаць добры рок-н-рол ды спаткаць людзей, якім хобі дазваляе адчуць сапраўдную свабоду.

i_basovka@o2.pl

Міра ЛУКША

# Жужаль з Жэрчыч

Жужаль бегае па полі,
Расхадзіўся як ніколі:
і хрушчам работы шмат,
калі вясна акурат:
вось наставіўшы жавачкі,
бы той трактар ці капачка,
у глебе рыецца, у травіцы,
і лічынкі, і гусеніцы,
выбірае, падлівае
і смакуе-пажырае.
Вось, наеўся-нарабіўся,
нататпаўся... Аж зваліўся,
аддыхнуцца, адпачыць.
Хопіць жэрці, хопіць рыць!
Ды як хуценька сарваўся,
выцер лапкі, аблізаўся,
ускаланўўся, страпянуўся,
па палетках азірнуўся...
— Карабус! Я — Карабус! —
Чарадзей-мядзяны вус!
Жужаль з Жэрчыч! Гэй, ура!
Хай жыве нам жамярва!

# Польска-беларуская крыжаванка № 18

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 14:

Воля, рана, рэха, сонца, вясна, урад, мяч, анёл. Ласяня, нос, ванна, цана, яр, ура, экран, сандал.

Узнагароды, каляровыя алоўкі, выйгралі **Ева Галёнка** з Арэшкава, **Ася Тарасюк, Матэвуш Крук** з Дубін, **Адрыян Ігнацюк** з Чыжоў, **Наталля Паскробка** з Нарвы. Віншуем!



## РАНА КВЕТКАЙ НА СЭРЦЫ

І яна — пайшла. Як зыходзяць ад нас самыя лепшыя на свеце жанчыны. Яны не гавораць чаму — проста зыходзяць і ўсё.

А мне — што заставалася рабіць з усім гэтым?.. Піць гарэлку не мог, не хацеў, не ўмею. Да бясконцасці шпацыраваць па вулках з такім жа бясконцым дажджом і снегам? Можна, канешне. Толькі колькі можна шпацыраваць, калі яе — няма побач?

Так, падумаў я, гэта рана. Гэта такая пякучая, незагойная, навылётная рана, якая абавязкова павінна застацца на сэрцы. Што ж, калі так... На кухні ў шуфлядзе бліснуў халодны нож. Але жыць, вельмі хацелася жыць! Асцярожна дастаў, заціснуў паміж ціскамі, хацеў ударыць каменем. Аднак, той камень... скрышыўся ў руках, ператварыўся ў прах, знік пылам у Сусвеце. У каменцы жарэлі вуглі — што калі прыкласці, трымаць і трываць, трываць? Будзе апёк, аперацыя ды перавязкі. Перавязак, аднак, не хацелася.

А можа, так па-дзікунску, па-звярынаму закрычаць, каб жахнулася сэрца ад болю і само пачало кроватачыць, і ўся тая кроў — увесь арганізм, усю душу ператварала ў адну гарачую рану?

Мой сябар увайшоў у пакой, калі я ўжо хацеў церануць па сэрцы самым буйным і грубым наждакам.

— Што ты робіш? — утаропіўся здзіўлена ён.

— Лепшы мой сябра! — яму адказаў. — Яна пайшла, і на сэрцы маім абавязкова павінна застацца крывадымная рана.

Сябра сеў у фатэль і спакойна прамовіў:

— Неяк ты гаварыў, што яна для цябе — як прыгожая кветка. Таямнічая, крыху прыадкрытая ружа, якая раскрываецца перад табой так паступова, пялёстачак за пялёсткам.

— Так! — перабіў яго я. — Але, на жаль, на вялікі жаль, да канца, да самага апошняга канца — яна так і не раскрылася перада мной...

Сябар моўчкі і ўважліва паглядзеў на мяне:

— Вось і пасадзі ў сваім сэрцы гэтую самую ружу. Пабачыш: пройдзе час, і яна — нарэшце раскрыецца там да канца, гэта табе гарантую. Як і тое, што будзе балець, моцна балець — гарантую таксама.

**07.03.2009,**
**Ігар СІДАРУК**

**Мікола КРАЎЧУК**

### *Трансфармацыі*

Што ж мы зробім, дарагія,
Калі мы ўжо такія:
Кожны сагнёны ў кручок.
Не пройдзеш без кладкі праз равок.
Мусіш аб штосьці апірацца,
Каб на другі бок перабрацца.
На другім беразе?.. — Дзе кладка?
Не пройдзеш усё так вельмі гладка.
І там, як хочаш, братка, жыці,
Таксама мусіш штось рабіці.
Кожны рабіў бы, каб прыйшлося.
Абы затрудніцца ўдалося!
Многія знайшлі сабе крыніцу:
Павандравалі за граніцу.
Улада сябе толькі глядзіць.
А простым людзям цяжка жыць.
Хутка мяняецца ва ўлад.
Усё абяцае кожны ўрад
І на вярхушку хто дастаўся.
А люд глядзеў і аблізаўся.

# За Саколкай

**Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА**

*(працяг з 17 н-ра)*

Бернікі мабыць калісь называліся Бернікоўцамі. Назва вёскі мабыць выводзіцца ад нейкага Бернарда, а дакладней кажучы, ад ягоных патомкаў. Заўважыў я там адну гаспадарку, якая, як мне падалося, канцэнтруецца на расліннай вытворчасці. А сама, даволі даўгаватая вёска, здаецца падлягаць грамадскай эрозіі, значыць вымыванню маладога яе насельніцтва ў гарады і адыходу жыхароў ад традыцыйнага сельскага гаспадарання. Няма тут хат новага дызайну, ёсць толькі традыцыйныя, драўляныя з мураванымі. Скарачаюцца традыцыйныя вясковыя гаспадарчыя будынкі, на многіх панадворках ад клуняў асталіся толькі бетонныя слупы, шмат пакінутых падмуркаў.

Выходжу з Бернік, а насупраць мяне два сарака- ці пяцідзесяцігадовыя мужчыны „ганяюць гусей"; значыць кідае іх нейкая дзіўная гравітацыя ад аднаго боку асфальтоўкі да другога. Ідуць стомленыя вандроўнікі з боку Залесся; магчыма, што яны там, у бакоўцы тамашняй крамы, працавіта абмяркоўвалі найбольш істотныя жыццёвыя пытанні.

На карце пазначаная дарога з Бернік у Падсудкі і я даверліва ступаю ў тым напрамку. Недалёка за вёскай два памінальныя помнікі: адзін па маладым мужчыне, які загінуў там у 1946 годзе, другі па маладым мужчыне, які загінуў там пяцьдзесят пяць гадоў пазней...

Летам 2001 года па аднаго пажылога жыхара Бернік прыехалі паліцыянты. Захацелася ім пазабаўляцца ў шэрыфаў, пастрашыць селяніна сваім табельным ружжом. А з ружжом забаўляцца нельга, трэба з ім абыходзіцца вельмі асцярожна. Вось і тады легкадумныя паводзіны стражаў правапарадку закончыліся трагічна, аднаму з іх жыццё абарвалася на дваццаць першым годзе; на месцы таго здарэння цяпер стаіць той помнік...

На згаданай мною дарозе з Бернік у Падсудкі пакінула ў снезе след толькі адна легкавушка. Шафёр-смяльчак занадта паверыў у магчымасці сваёй машыны і яна не справілася з балотна-снежным насцілам. Праўда, я таго здарэння не аглядаў, але бачыў сляды беспаспяховага змагання шафёра і след трактара, які прыязджаў на ратунак. Так бывае, калі шафёры самаходаў выбіраюцца ў дарогі, трасіраваныя ў конскую эпоху...

Першы панадворак у Падсудках прадвяшчаў сумную сустрэчу з вёскай: апусцелая вялікая абора, мёртвая стадола. З балоцістай вуліцы зацікавілі мяне каменныя сцены старога збудавання, якое падалося мне свірнам; за ім стаяла пажылая жанчына і выглядала на вуліцу. Завёў я з ёю гутарку...

Згаданы будынак, што здаўся мне свірнам, гэта хлеў. Пабудаваў яго яшчэ мабыць дзедка маёй субяседніцы, якой зараз 84 гады; значыць сам той хлеў мог быць узведзены каля 1880 года. А будавалі тады часта з камянёў, бо гэтага матэрыялу было многа на навакольных палях, а з драўнінай для будаўніцтва было тугавата.

Спытаў я яшчэ пра недалёкую хату са старых дыляў, дзе дах пачаў ужо ўгінацца пад цяжарам гадоў. Жыве ў той хаце чалавек, каля сямідзесяцігадовы, адзінокі, і вядзе ён вялікую гаспадарку, якую сам абрабляе. Трымае ён кароў, свіней, каня...

Гутарка зышла на чарговага тамашняга кавалера, сына маёй субяседніцы. З ім вялікая бяда — п'е, пра гаспадарку не дбае. А тут дванаццаць кароў і пра ўсё гэта трэба клапаціцца ягоным старэнькім бацькам. Траіх у вёсцы такіх нежанатых, што невядома дзе збіраюцца і запіваюцца. Вось яе сын вяртаецца дадому і не ведае, якая пара сутак: раніца гэта ці вечар. І ў апошнюю раніцу заглянула яна да яго — ляжаў у ложку з пустой ужо бутэлькай на падушцы. Як ксёндз па калядзе хадзіў, прасіла, каб прыцягнуў ейнага сына да прысягі, што перастане піць. Але ксёндз адказаў, што можа прыняць такую прысягу толькі тады, калі сын сам захоча яе прынесці. І не відаць ад гэтага ратунку, званіла ўжо адчайная маці дачцэ ў Беласток, гаварыла, што яна ўжо ад гэтага хворая. І невядома, адкуль тыя п'яніцы бяруць гарэлку, можа „рускія" яе прывозяць...

І стоячы каля плота яна і цяпер выглядала сына, што той адумаецца, вернецца і зоймецца тымі дванаццаццю каровамі. Такі лёс людзей, якія астаюцца вернымі традыцыйнаму сялянскаму побыту, прывязанасці да земляробства, калі іх нашчадкі, не ўвайшоўшы ў сямейныя каляіны, знаходзяць суцяшэнне ў іншых формах жыццёвых заняткаў. І вельмі верагодна, што той першы панадворак, апусцелы, не адзіны не толькі ў гэтай вёсцы, а ў перспектыве такі ж лёс наканаваны і іншым панадворкам, якім не будзе гаспадароў.

Ад Сідэркі ў бок Падсудкаў прабіраецца легкавушка, паварочвае яна ў дарогу да аднаго хутара з вялікім жылым домам. Праехаўшы некалькі метраў, аддае яна назад, затрымліваецца на балоцістай дарозе, па якой прыехала. З машыны выходзіць пісьманосец і пехатою месіць балота ў намечаны адрасам хутар. Мо гэтая самая машына днём раней эканоміла дарогу з Бернік у Падсудкі...

*Помнік з царскага часу*

*Стадола без сцен у Берніках*

*Дарога з Падсудкаў у Сідэрку абрастае лесам*

# У арлянскай школе

Міхал МІНЦЭВІЧ

**Пра дасягненні вучняў з Арлянскай гміны, пра іх пазаўрочныя заняткі і новыя ініцыятывы пісаў я ў „Ніве" ад 19 кастрычніка мінулага года. Аднак гэта не ўсё, бо ў нашай школе ад трох гадоў адбываюцца незвычайныя падзеі — тут даволі часта паказваюцца размаітыя выставы (адбылося іх ужо звыш дзесятка), якіх аўтарамі і арганізатарамі з'яўляюцца і настаўнікі, і вучні...**

А помню добра, што яшчэ ў 1990-х гадах немагчыма было наладзіць у Орлі вялікай фотавыстаўкі пра мясцовую гісторыю. Для гэтага не было ні згоды, ні падтрымкі з боку начальства, а новы школьны будынак быў быццам чужы жыхарам, у які не было як зайсці (было пра гэта ў „Ніве" ад 15 снежня 1996 года). Удалося мне гэта змяніць толькі ў верасні 1998 года. Мая тадышняя фотавыстаўка „Пяць стагоддзяў Орлі і наваколля", якая ў прынцыпе грунтавалася на маіх ніўскіх публікацыях і здымках, прычынілася, м.інш., да склікання ў палове верасня таго ж года нечарговай канферэнцыі настаўнікаў беларускай мовы пачатковых і сярэдніх школ Беласточчыны пад лозунгам „Ведаць мінулае — заглядаць у будучыню" („Ніва" ад 4 кастрычніка 1998 г.).

Прамінула дзесяць гадоў і група арлянскіх вучняў дабілася агульнапольскага поспеху ў галіне прапагандавання рэгіяналізму. Годам раней пазаўрочныя заняткі былі добра ўспрыняты кураторыяй. Заслуга ў гэтым вучняў і настаўнікаў, але таксама і пачыну новага дырэктара школы Дарыюша Гарадэцкага, які сказаў мне:

— Паводле праведзенай кураторыяй у чэрвені 2007 года комплекснай праверкі нашай школы, асаблівай увагі заслугоўваюць нашы пазаўрочныя заняткі. Нашы вучні за фільм „І асталася толькі сінагога" перамаглі ў агульнапольскім маладзёжным краязнаўчым конкурсе „Пазнаем бацькоўшчыну". Вучні — аўтары фільма — з'ездзілі ў Влацлавак на трохдзённае падсумаванне гэтага праекта і на ўрачыстасць уручэння ўзнагарод. Мяне, як апекуна, таксама вылучылі Галоўнае праўленне Польскага турыстычна-краязнаўчага таварыства і Міністэрства нацыянальнай адукацыі; 15 кастрычніка таго ж года ў Міністэрстве атрымаў я пахвальны ліст за прапагандаванне рэгіяналізму ў школе. Быў я там адзіным прадстаўніком Падляшскага ваяводства ў ліку амаль паўсотні настаўнікаў з усёй краіны.

Вернісажы ў 2006-2007 навучальным годзе ладзіліся ў спартыўнай зале, а затым, пасля месяца, выстаўкі пераносілі на прасторны школьны калідор. Такім чынам былі паказаны:

— выстава мастацкіх прац Анатоля Краўчука з Крывой;

— „Цэрквы і манастыры Расіі", ладжаная шчытоўскім настаяцелем Янам Стэпанюком;

— „Ян Павел II у Драгічыне", нарыхтаваная Згуртаваннем „Акно" ў Бельску, а ў Орлі здзейсненая Дзмітрыем Мартыновічам;

*Генеральны дырэктар Міністэрства нацыянальнай адукацыі Роберт Бартольд узнагароджвае ганаровай граматай дырэктара Дарыюша Гарадэцкага (справа)*

— прэзентацыя слайдаў „Драўлянае сакральнае будаўніцтва Карпат", нарыхтаваная гайнаўскім турправадніком Рыгорам Петрашкам.

У 2007-2008 навучальным годзе адбыліся:

— выстава „Акрайкі нашай гісторыі" да 500-годдзя Орлі, нарыхтаваная Беатай і Дарыюшам Гарадэцкімі (пазней выстаўка паказвалася ў Музеі беларускай культуры ў Гайнаўцы);

— „Калі нашы бацькі хадзілі ў школу", падрыхтаваная Беатай Гарадэцкай;

— „Святая Зямля", наладжаная псаломшчыкам Дзмітрыем Мартыновічам, настаўнікам катэхізісу;

— выстава мастацкіх прац Славаміра Рыбака;

— мультымедыйная прэзентацыя „Элементарныя бедствы на Падляшшы", нарыхтаваная настаўніцай гісторыі Іааннай Корх.

У цяперпашнім навучальным годзе адбыліся ўжо тры выставы:

— выстава мастацкага даробку малодшых вучняў (з нулявога да трэцяга класаў), якія займаліся ў пластычным гуртку, нарыхтаваная настаўніцамі Альжбетай Цюлькевіч і Івонай Жужаль;

— фотавыстаўка „Святы Рыгор Перадзе, сын Грузінскай царквы", арганізаваная Дзмітрыем Мартыновічам у супрацоўніцтве з гайнаўскім „Братчыкам";

— „Генеалагічныя карані вучняў чацвёртага і пятага класаў" ды „Гісторыя бежанства", запісанага дзяцьмі ў сем'ях — якія арганізавалі Іаанна Корх і Дзмітрый Мартыновіч.

Дадам, што ад двух гадоў у час выставак адбываюцца таксама прэзентацыі калядак лаўрэатамі школьнага агляду, якія ладзіць Дзмітрый Мартыновіч.

А я правёў гутарку з дырэктарам Дарыюшам Гарадэцкім:

— Як гэта ўсё пачалося, на чым засноўвалася сістэматычная прэзентацыя выставак і прыцягненне вучняў да зацікаўлення сваёй гісторыяй?

— З першага года маёй працы мы стараліся сістэматычна пакрысе купляць для выставачных мэт прэзентацыйныя шчыткі. Зараз, пасля трох гадоў, маем іх трыццаць штук, а стойкі для іх выканаў саматужна наш стораж.

Задума наша выходзіла з многіх аспектаў. Па-першае, гэта зацікаўленне рэгіёнам, каб тое дзіця ведала крыху больш пра сваю мясцовасць, пра сваю сям'ю. Каб усведамляла найважнейшае: адкуль я, хто я, кім сябе адчуваю. Да гэтага асэнсавання дзіця павінна дайсці самастойна, пры дапамозе бацькоў. А школа мае даць магчымасць, падказаць. Бо ўсё выхаванне ў руках бацькоў. Яны вырашаюць пра будучыню дзіцяці, а школа дапамагае ім у гэтым.

Па-другое: такія выставы і сустрэчы знаёмяць з мастацтвам, бо ў нашай школе мы ладзілі і выстаўкі жывапісу, і фотавыстаўкі, і сустрэчы з цікавымі людзьмі. Гэта ўсё з мэтай зацікаўлення маладых людзей, паказу ім шырэйшых магчымасцей, бо ж у прынцыпе на вёсцы маюць яны толькі тэлевізар... А пасля той малады чалавек едзе ў шырокі свет і не ведае як сябе паводзіць, як карыстацца. Ён не ведае, што ў горадзе можна пайсці на выставу, што ёсць людзі, якія займаюцца вельмі рознымі справамі. І мерапрыемствы, якія мы ладзім, маюць знаёміць нашых выхаванцаў з іншымі людзьмі, адкрываць іх на свет, фарміраваць іх.

Па-трэцяе: гэта таксама праца ў калектыве, гэта творчы працэс сабе і іншым. Дзеці займаюцца гэтым пасля ўрокаў, але гэта іншая дзейнасць чым пазаўрочныя заняткі, калі пасля сарака пяці хвілін дзеці разыходзяцца па сваіх хатах. Бо тут дзіця мае нешта выканаць і дома, пашукаць, апісаць, так як, напрыклад, гэта было ў выпадку пазнавання сваіх генеалагічных каранёў ці сямейнай гісторыі бежанства. Бо тая гісторыя, як заўважыў катэхет Дзмітрый Мартыновіч, паволі затухае. Дзеці ведаюць пра нейкія здарэнні, але гэта толькі акрайкі інфармацыі. Нашы вучні (і некаторыя настаўнікі — М. М.) раней удзельнічалі ў збіранні фатаграфій, іх апісанні для выставы „Акрайкі нашай гісторыі". У такія заняткі дзеці ангажуюць таксама сваіх бацькоў.

— Адкуль прапановы выставак, ці гэта спадар дырэктар?..

— Не толькі. У прынцыпе ўсе настаўнікі зацікаўлены гэтым, а дырэктар адно падмацоўвае, вызваляе іх энергію. Я сам таксама рыхтаваў з настаўнікамі некалькі выставак. Настаўнікі бачаць, што іх праца дае плён. Тут хачу асабліва падкрэсліць заангажаванне Дзмітрыя Мартыновіча, які запрэзентаваў тры выставы.

— Як праводзяцца выставы ў школе і як цікавіцца імі грамадства, хто бывае на іх?

— Вернісаж адбываецца ў нашай гімнастычнай зале, а пасля выставу пераносім на адзін са школьных калідораў, дзе яна астаецца на працягу месяца, калі яе можна аглядаць, аналізаваць. Мяркую, што яна пакідае след у памяці вучняў на будучыню. Такая выстава прыцягвае ўвагу, гледачы спыняюцца, знаёмяцца.

Нашы выставы наведваюць таксама жыхары Орлі і навакольных мясцовасцей, заўсёды запрашаем настаўнікаў-пенсіянераў, буйнейшыя выставы наведваюць гмінныя ўлады і тыя, у каго вольны час. Заўсёды заглядаюць на іх арляне, што жывуць недалёка школы. З выставамі знаёмяцца таксама пацыенты нашага стаматолага, які мае ў нас кабінет. Для дзяцей, аўтараў выставак, важнае і станоўчае ўспрыманне іх працы іншымі.

У мінулым годзе нашу школу наведалі вучні з Храбалоў, якія знаёміліся з нашым школьным музеем. У лютым гэтага года нашу школу наведаў Веслаў Врублеўскі, 80-гадовы сын Тадэвуша Врублеўскага, які быў загадчыкам арлянскай школы ў 1921-1941 гадах. Саветы ягоную маці-настаўніцу Марыю, сястру Данусю і яго вывезлі ў Сібір, адкуль ім удалося вярнуцца; бацьку вызвалілі з турмы беластачане ў пачатку нямецка-савецкай вайны. Зараз пан Веслаў пражывае ў Едлічах, што каля Кросна ў Падкарпацкім ваяводстве. Яго захапіў наш школьны музей, асабліва ж праваслаўныя гвязды ўсхвалявалі яго да слёз. Бо прыгадалі яны яму дзяцінства, калі жыў ён па Бельскай вуліцы і дзеці прыходзілі да іх калядаваць. Зрабіў ён шмат здымкаў, запісаўся ў школьнай хроніцы. Сустрэўся ён з трэцім класам і расказаў, як выглядала Орля калісь. Апякун каталіцкай капліцы, што цяпер у былым школьным будынку, адчыніў яе і ён паказаў, дзе калісь была іх кватэра. (Цікава яшчэ адно: калі нарадзіўся ён, а пасля ягоная сястра, іх бацькі пасадзілі побач школы па адной бярозцы, яны выраслі вялікія, нядаўна іх ссеклі — М. М.) Завёў я іх у сінагогу, пахадзілі па рынку. Пасля наведаў ён свайго школьнага аднагодка Стэфана Рыбака. Шкада толькі, што не ўспеў ён сустрэцца з іншымі сябрамі з дзяцінства. (Прыемна, што ўсе пажылыя жыхары Орлі цёпла ўспамінаюць сям'ю Врублеўскіх — М. М.)

Вельмі важным лічу штогадовае мерапрыемства, якое пачалі мы тры гады таму — Дні беларускай культуры. Даем аб'явы і кожны можа да нас прыйсці. Дзеці паказваюць тады свае дасягненні і знаёмяцца з дарослымі мастакамі. Гэта падводзіць круглагадовую працу нашай школы.

**Фота са школьных фондаў**

# Беларусь учора і сёння

**Цэнтр навуковых даследаванняў пры Асяродку навуковых даследаванняў імя Войцеха Кентшынскага ў Ольштыне, у якім праграмным каардынатарам працуе прафесар Мечыслаў Яцкевіч, 19 сакавіка г.г. наладзіў чарговую сустрэчу, прысвечаную Беларусі.**

Арганізатары запрасілі прафесара Аляксандра Краўцэвіча з Гродна, які расказаў пра фармаванне беларускіх эліт у пачатку XX стагоддзя. Шмат увагі дакладчык прысвяціў Вацлаву Іваноўскаму, ягонаму выдавецтву „Загляне сонца і ў наша ваконца" ды Беларускаму выдавецкаму таварыству. Варта падкрэсліць, што ў 1906-1915 гг. выйшла каля двухсот кніг на беларускай мове агульным тыражом каля трохсот тысяч асобнікаў, выдаваліся часопісы накіраваныя сялянам, моладзі і іншым групам насельніцтва. Аднак мары беларускіх адраджэнцаў пра сваю дзяржаву не збыліся, Беларусь была падзелена між Польшчу і бальшавіцкую Расію. У Польшчы, здамінаванай эндэцкай ідэалогіяй, пайшлі асіміляцыйныя працэсы, не лепш выглядалі справы і за ўсходняй мяжой. Знакавая падзея адбылася ў 1933 г., калі на польска-савецкай граніцы наступіла замена двух беларускіх зняволеных: саветы выпусцілі ў Польшчу вядомага беларускага драматурга Францішка Аляхновіча, а ўзамен атрымалі аўтара першай сучаснай беларускай граматыкі Браніслава Тарашкевіча, якога неўзабаве — у 1937 г. — расстралялі. Мінаючыся ў нейтральнай зоне, яны некалькі хвілін размаўлялі; пра што — невядома.

Пасля другой сусветнай вайны наступіла бурная індустрыялізацыя Беларусі, якая разбурыла вёску, галоўнага носьбіта беларускай нацыянальнай культуры. Вынікам урбанізацыі стала дэнацыяналізацыя беларусаў, бо гарады падлягалі русіфікацыі, выконваючы функцыю „асіміляцыйных катлоў". У завяршэнне даклада прафесар Краўцэвіч сказаў, што дзесяць гадоў незалежнасці ў канцы XX стагоддзя ажывілі працэс фармавання і мацавання беларускай нацыянальнай ідэі, далі штуршок далейшаму развіццю беларускіх эліт.

Другім дакладчыкам быў Павел Вусаў з Магілёва. Нарадзіўся ён у 1975 годзе, завяршыў Магілёўскі ўніверсітэт імя Аркадзя Куляшова, займаўся палітычным аналізам праблем сучаснай Беларусі і іншых постсавецкіх дзяржаў. Нейкі час працаваў выкладчыкам у сваёй вучэльні, аднак за палітычную актыўнасць быў у 2005 годзе звольнены з працы. Зараз у Польскай акадэміі навук піша кандыдацкую дысертацыю на тэму палітычнага рэжыму ў Беларусі.

Павел Вусаў сказаў, што цяперашні крызіс Лукашэнку не пагражае, бо толькі пяць адсоткаў беларусаў гатовых дэманстраваць супраць улады. Беспрацоўя ў Беларусі афіцыйна няма, яно парадку 1-2%, аднак цяпер рабочыя вымушаны браць водпускі ды заміж шасці дзён у тыдні працуюць па два-тры дні. Большасць беларускіх тавараў залягае ў складах, бо Расія і еўрасаюзныя дзяржавы, якія іх куплялі, сёння не зацікаўлены імі. Лукашэнка намагаецца дынамізаваць беларускую эканоміку; да гэтай пары яму гэта ўдавалася. Трэба заўважыць, што крызіс пагражае грамадскай і палітычнай дэстабілізацыяй дзяржавы, таму Лукашэнка карыстаецца ўсімі магчымасцямі, каб мінімалізаваць ягоныя паслядоўнасці. Выхадайнічаў ён крэдыты ў Кітаі і ў Венесуэле; атрымаў таксама крэдыт у 2,5 мільярда долараў з Міжнароднага валютнага фонду для ратавання беларускай эканомікі. Па сутнасці 80% цяперашняга бюджэту Беларусі асноўваецца на замежных крэдытах, аднак гэта не стварае пагрозы, што ў выніку насельніцтва можа страціць сваю маёмасць; да гэтага Лукашэнка не дапусціць. Па ацэнках апазіцыі, удзельнікі прэзідэнцкіх выбараў з 2006 года Мілінкевіч і Казулін маглі б разам разлічваць сёння на 8% падтрымкі, бо цяпер ніхто не хоча выступаць супраць Лукашэнкі.

Трэці даклад на тэму саветызацыі Беларусі ў 1944-1953 гг. зачытаў д-р Ян Шумскі. Закрануў ён шмат праблем, у тым ліку пра адносіны між палякамі і беларусамі, пра падполле, пра стэрэатып беларуса. Складалася ўражанне, што беларусы на фоне іншых нацыянальных груп у Беларусі пакорліва падпарадкоўваліся новым парадкам і не супрацьстаўляліся саветызацыі. Пасляваенны беларускі антысавецкі рух не стварыў падпольных структур, як гэта было ў выпадку палякаў ці ўкраінцаў, і не меў ён амаль ніякай падтрымкі ў грамадстве. Дакладчык гаварыў таксама пра пасляваенную мабілізацыю беларускага насельніцтва ў войска і прамысловасць, рэпатрыяцыю і перасяленні, кадравую палітыку, адносіны Масквы да правінцыі, асвету, адмежаванне ад вонкавага свету.

Мерапрыемства ў Асяродку навуковых даследаванняў у Ольштыне было вельмі павучальнае і вялікае за гэта дзякуй прафесару Мечыславу Яцкевічу.

**Андрэй ГАЎРЫЛЮК**

Горад Глыбокае — гэта даволі буйное па беларускіх мерках старажытнае паселішча. Знаходзіцца яно на поўначы Беларусі, у Віцебскай вобласці. Аб тым, якая даўняя гісторыя ў Глыбокага мы можам даведацца, зайшоўшы на сайт яго гісторыка-этнаграфічнага музея.

Калі цікаўны віртуальны вандроўнік набярэ на сваім камп'ютары адрас у інтэрнэце www.glubmusej.of.by, то перад ягонымі вачыма адкрыецца сціплае, але прыцягальна-спакойнае выяўленне галоўнай старонкі музейнага сайта. Карычневы колер сам па сабе носіць адценне нейкай даўніны, таму выбар вэбдызайнера зрабіць гэты колер асноўным, без перабольшання ёсць слушным рашэннем.

Што ж тычыцца зместу прывітальнага тэксту да віртуальных наведвальнікаў, то супрацоўнікі музея выдатна выбралі словы. „Багатая гісторыя рэгіёна абумовіла неабходнасць стварэння ў Глыбокім установы, якая б займалася вывучэннем мінуўшчыны нашага краю, — распавядаюць пра музей аўтары сайта. — І вось ужо 9 год супрацоўнікі музея плённа працуюць на гэтай ніве. Азнаёміўшыся з матэрыяламі нашага сайта, вы можаце здзейсніць віртуальнае падарожжа па музейных залах, наведаць адно з прыгажэйшых месцаў Беларусі — культурна-дэндралагічны комплекс Мосар, даведацца пра навіны культуры Глыбоцкага раёна. Можна спадзявацца, што пасля наведвання сайта ў вас з'явіцца жаданне прыехаць да нас у госці і пабачыць усё сваімі вачамі. Мы вас сардэчна запрашаем і абяцаем — вы не пашкадуеце".

Пасля такіх інтрыгуючых слоў, азнаёміцца з сайтам ёсць натуральнай патрэбай. І гэтае азнаямленне сапраўды не дасць падстаў шкадаваць аб патрачаным часе.

Першая старонка, якая ідзе пасля галоўнай, ёсць „Гісторыя Глыбоччыны". Сярод звычайных для такога раздзела гістарычных звестак, мы даведаемся, што Глыбокае і яго наваколлі былі малой радзімай для шэрагу слынных асобаў. Тут нарадзіліся першы прэм'ер-міністр Беларускай Народнай Рэспублікі, гісторык і палітык Вацлаў Ластоўскі, вядомы архітэктар Клаўдзій Дуж-Душэўскі, бацька беларускага тэатра Ігнат Буйніцкі, мастак і археолаг Язэп Драздовіч, пісьменнік Тадэуш Даленга-Мастовіч, авіяканструктар Павел Сухі.

Музей мае і сваю візітоўку. Ёю лічыцца „яўрэйская гандлёвая лаўка", дзе манекен гандляра-яўрэя вітае наведвальнікаў, нібыта запрашаючы азнаёміцца з асартыментам. У адрозненні ад іншых музеяў, дзе рабіць фотаздымкі забаронена, тут на гэтае дзеянне глядзяць вельмі спагадліва.

Старонка „Этнаграфія" больш дэтальна распавядае пра побыт жыхароў Глыбокага. Для прыкладу, нас запрашаюць у госці да глыбоцкага мешчаніна. Знаёмства з бытам прадстаўніка гэтага саслоўя і ўнікальнымі прадметамі мэблі пад гукі музыкі са старога патэфона, па сведчаннях супрацоўнікаў музея, надасць асаблівую атмасферу экскурсіі.

Узгаданы вышэй комплекс Мосар займае асобную рубрыку на сайце. Пра яго культурна-дэндралагічныя асаблівасці можна распавядаць многа, але лепей на свае вочы пабачыць адроджаны пасля камуністычнага забыцця адзін з прыгажэйшых куткоў Беларусі.

Нягледзячы на выдатную прэзентацыю музея, данаму сайту ўсё ж не стае апаратыўнага абнаўлення. У „Навінах культуры" змешчана толькі адна далёка ўжо неактуальная абвестка.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**

# Беларусь,беларусы...

## *„Чарнобыльскі шлях 2009" у Нью-Йорку*

26 красавіка ля будынка ААН беларуская дыяспара Нью-Йорка правяла дэманстрацыю, прысвечаную 23-й гадавіне тэхнагеннай катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, якая нанесла непапраўныя страты Беларусі.

У дэманстрацыі ўдзельнічала каля 60 чалавек, якія прыехалі з розных куткоў Амерыкі — Нью-Йорка, Нью-Джэрсі, Дэлавэра, Мэіна і іншых штатаў.

На пікеце выступілі вядомыя беларусы: заснавальнік БАЗА Антон Шукелойц, скульптар і мастак Алесь Шатэрнік, сябра парафіяльнай рады сабора св. Кірылы Тураўскага ў Нью-Йорку Мікола Сагановіч і лідары моладзевых арганізацый. Моладзевыя актывісты распавялі моладзі пра сваю дзейнасць і пра тое, што магчыма зрабіць агульнымі намаганнямі для дапамогі Бацькаўшчыне.

Удзельнікі дэманстрацыі праспявалі: «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» і «Магутны Божа».

Жыве Беларусь!!!

**Беларускі моладзевы рух Амэрыкі**
**www.belmov.org**

# Абследаванне

Кажуць, што некаторыя нараджаюцца пад шчаслівай зоркай і для іх у жыцці шанцуе як з яйца дык да канца. А мне чамусьці заўсёды вецер у вочы. Адны неспадзяваныя сюрпрызы лёс падкідае...

Перад Вялікаднем рашыў я купіць вепручка ды свежую каўбаску дзецям і ўнукам зрабіць. А што вымушаны быў сам справай заняцца, тады ад світання да змроку абавязкаў хапала. У перадсвяточны чацвер, на адвячорку, пакаўзнуўся я на слізкай падлозе, зваліўся з ног і так грымнуўся галавою ў кант зэдліка, што ледзь вока не вылупіў. Пазваніў дачцэ ў Чаромху, каб прыехала. Калі яна зайшла ў дом і паглядзела на маё вока (было падпухлае і зачырванелае) прапанавала неабходна падацца да акуліста.

У пятніцу пазваніў я ў рэгістрацыю Гайнаўскага шпіталя і папрасіў, каб „выцягнулі" картатэку да лекаркі Буйноўскай. Заявіў, што пацярпеў траўму вока і запытаў, ці не патрабуецца накіраванне ад сямейнага лекара. У трубцы пачуў жаночы голас: „Накіравання не трэба. Доктар Буйноўская не прымае, але працуе ад восьмай да адзінаццатай д-р Златкоўская. Калі прыедзеце, тады дамо картатэку".

У рэгістрацыі я з'явіўся без дзесяці адзінаццаць (прастаялі больш дзесяці мінут „у корку", бо ссякалі перад Гайнаўкай прыдарожныя засохлыя дрэвы). Мне выдалі картатэку. Перад кабінетам акуліста чакала каля дзесяці асоб. Я перадаў картатэку санітарцы і заявіў, што пацярпеў траўму. Гэтая нічога не адказала. Прыём да лекара праходзіў паводле прозвішчаў зачытаных санітаркай. Мяне не выклікалі. Штораз падыходзілі пацыенты з картатэкамі і некаторыя былі неўзабаве прынятымі. Пра мяне ніхто не згадваў. Недзе праз гадзіну „прыпомніўся" я санітарцы і пачуў такі адказ: „Я прад'явіла пані доктар, што вы сказалі...". Чакаў я чарговую гадзіну. Ніхто не варухнуў пальцам у маёй справе. Калі санітарка выклікала чарговага пацыента, тады я запытаў, калі буду прыняты.

— Pan jest ostatni w kolejce, — няветліва кінула ў мой бок.

— A ile osób przede mną? — пытаю.

— Te co widać...

У чарзе чакала больш пяці асоб. Я ўжо не стрымаўся ад злосці і заявіў санітарцы, што пайду на скаргу да дырэктара. Рашыў дамоў паехаць, але дачка раіла застацца. Выйшла і пані доктар, а калі ўгледзела маладых хлопцаў, якія чакалі „камісійнага" абследавання, пачала іх сароміць за тое, што нечаргова праходзяць, калі ў чарзе чакаюць хворыя старэчы. За апошнім разам санітарка зачытала і маё прозвішча (некалькіх зачытаных не было ў чарзе). Калі я адклікнуўся „естэм", гэтая адвярнула галаву ў бок сядзячага насупраць мужчыны і сказала: „Teraz pan pójdzie".

Пані доктар „абслужыла" мяне пасля першай. Паглядзела хворае вока, запусціла кроплі і сказала прысесці на кушэтку, зачым выклікала чарговага пацыента. Тады пачуў я вось такую гаворку:

— A który to taki nerwowy? — пытала доктар санітарку. Гэтая кіўнула галавою ў мой бок.

— A, to ten?...

Я зразумеў сутнасць намёку і чакаў далейшага ходу справы. Пані доктар шукала прычыны для спрэчкі. Пачаткова папракнула, што не лічуся яе пыцыентам і дапамінаюся пазачарговага абследавання, калі з гэтым мог бы справіцца сямейны лекар, бо яна не бачыць у маей траўме нічога асаблівага. Я патлумачыў, што не з'яўляюся знатаком медычных спраў і амаль трыццаць гадоў лячыўся ў доктар Буйноўскай.

— To trzeba było do niej pójść, a nie do mnie...

— Dlaczego pani taka złośliwa?.. — кідаю няветліва субяседніцы.

— To pan robi awantury...

Не стану прыводзіць далейшага дыялога, бо не бачу патрэбы. Хачу адно адзначыць, што пані доктар адмовілася ад сваіх слоў, у якіх дапытвалася пра „сварлівага" пацыента. Не магу таксама зразумець, чаму спасылалася на традыцыю вялікай пятніцы, калі гэта быццам бы не выпадае весці спрэчак і сварак паміж сабою. Як затым пракаментаваць ейныя паводзіны ў адносінах да хворага інваліда? Ці гэта не крывадушнасць?

Канчаткова доктар скрупулёзна абследавала мае вочы пры дапамозе прыбораў, запісала лякарства. Калі я запытаў, ці можна атрымаць рэцэпт на акуляры, тады заявіла: „Трэба ў чаргу прапісацца... Да мяне на ліпень прапісваюцца. А праўду сказаўшы, перш-наперш трэба хворае вока падлечыць". І тут маё пытанне: ці мой візіт у акуліста быў сапраўды неабгрунтаваны, з якім мог бы справіцца сямейны лекар? А мо гэта проста лекарская звычка неакуратнага стаўлення да пацыентаў, якія адважваюцца сказаць медыку праўду ў вочы? Спадзяюся, што на гэтыя пытанні чытачы самі знойдуць адказ.

**Уладзімір СІДАРУК**

# Чэрці ў царкве

Вельмі цікавы рэпартаж Міры Лукшы аб пабыўцы шаптухі Ганны ў царкве ў Дабрывадзе патрабуе, памойму, пэўнага каментарыя з праваслаўнага пункту погляду. Вядома, што Царква не ўхваляе магічных практык, паколькі бачыць у іх сатанінскія дзеянні, а асоб, якія займаюцца варажбой, магічнымі лекавымі працэдурамі, спірытызмам і іншымі эстрасенснымі практыкамі, лічыць апантанымі злымі духамі, якім неабходнае аздараўленне. З гэтага гледзішча асоба Ганны — з'ява адназначна адмоўная і папраўдзе з-за свайго настойлівага ўдзельніцтва ў магічных практыках сама сябе выключае з царкоўнай супольнасці. Хіба толькі вялікія грошы, якія перадае яна ў рукі некаторых бацюшкаў, а таксама псеўдарэлігійны камуфляж яе магіі (чытанне г.зв. „малітваў") дазваляюць гэтай жанчыне адчуваць сябе паўнавартаснай праваслаўнай верніцай. Але дзеючым праз яе пасрэдніцтва чэрцям гэтага мала: Ганна пачынае „прароччыць" на царкоўныя тэмы і дзіўна паводзіць сябе ў храме. Унікніце ў ейныя словы аб выдуманай абіцелі ў Дабрывадзе: гэта ж, як кажуць, „бред сивой кобылы"! А нашым людзям многа не трэба: адзін уздыхне, другі слязу пусціць, трэці раскажа як гэта шаптуха дапамагла ягонай цешчы — і ў свет ідуць чуткі аб новых прароцтвах. І толькі здзіўляцца трэба, што грошы аж так засланяюць вочы і муцяць галаву нашым святарам, што ніхто з іх не рашаецца публічна растлумачыць вернікам асноўныя справы, якія выцякаюць з першай і трэцяй запаведзей Божых!

Рэпартаж Міры Лукшы — прыклад цікавага падыходу да тэмы, якая датычыць многіх чытачоў. Вялікае дзякуй ёй за гэта. І толькі з адным сказам не магу згадзіцца: „Ганна з Рудкі, шчырая хрысціянка, вядомая з блаславёнай Госпадам дзейнасці лекавання..." Але аб гэтым я напісаў вышэй.

**Марк ЦЫБАРТ**

## *Збірайце зёлкі!*

Зараз на зёлкі ўсё большае і большае запатрабаванне. Выкарыстоўваем іх у фармацэўтычнай, касметычнай і харчовай прамысловасці (у той апошняй у мясных і апрацоўчых прадпрыемствах ды ў цукраварнях). А хто не піў гарэлкі „Зуброўкі"?! Зёлкі прымяняюцца ў дамашняй гаспадарцы — як прыправы да страў, адвары ды смакавітыя напоі.

Цяпер вясна ў разгары. Збірайма зёлкі! Гэты занятак выгадны і карысны. Пасля зімы ўжо ў вёсках Гайнаўшчыны пачалі працаваць пункты скупкі лекавых зёлак, м. інш., суполкі „Руно" ў Гайнаўцы. Вопытныя збіральнікі маюць магчымасць зарабляць. Дастаткова хацець, мець крыху ведаў пра лекавыя расліны і пра спосабы іх сушэння.

І так кілаграм сушанага карэння пяцёрніка каштуе 13 злотых ды карэння дзьмухаўца — 8,50 зл., ягад ядлоўцу — 7 зл., парасткаў сасны — 9 зл., лісця брусніцы — 120 зл., кары каліны — 7 зл. і крушыны — 4 зл., а зелля амялы — 2,50 зл. У маі, чэрвені і ліпені будзе процьма зелля і будзе можна даволі шмат зарабіць.

Калі збярэм больш зёлак, тады на нашым рынку будзе больш зёлкавых лякарстваў, вітамінізіраваных сіропаў, сумесяў і г.д.

**(яц)**

# Адгаданка




**Шыфраграма**

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — арабскую пагаворку.

1. ручное прыстасаванне з пласцінак у выглядзе складнога паўкруга для абмахвання ў духату = 12 _ 20 _ 26 _ 10 _;

2. левы бок бухгалтарскага балансу = 18 _ 11 _ 23 _ 24 _ 21 _;

3. важны прамысловы цэнтр у Цюрынгіі між Веймарам і Герай = 8 _ 17 _ 27 _ 22 _;

4. паглядаючы на дзяўчыну Ясь ад канюшыны = 15 _ 19 _ 3 _ 2 _ 25 _;

5. урачысты верш прысвечаны важнай падзеі або герою = 16 _ 9 _ 13 _;

6. літаратурнае імя Івана Дамінікавіча Луцэвіча = 5 _ 1 _ 6 _ 7 _;

7. касец канюшыны = 14 _ 4 _ 28 _.

**(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 13 нумара**

Каліва, ледакол, вера, таз, Вілія, Сенегал, дамка, жаба, бюро, муха, жэле, гаварун, трава.

Рашэнне: **Ветлівае слова адамкне жалезную браму.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
***Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.***

**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

**Prenumerata krajowa**
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

**Prenumerata z wysyłką za granicę**
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819 — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

**Prenumerata w redakcji**
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

**Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,70 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

**Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

**Nakład**: 1 500 egz.

# Гісторыя пра каня і маскоўскія тэлеканалы

Ева СЦЕПАНЮК

**У аўтобусе пахла дажджавым чарвяком. За Кабылянкай нехта ўзяўся жэрці каўбасу. У пахавым букеце луналі яшчэ ноткі мокрага пер'я, свежай крапівы, свінога гною...**

**Хацелася завыць ад гэтага багацця: ах ты, родная ароматэрапія! Ад яе калола ў мазгах, свярбела цела, млелі рукі. І нічога не хацелася. Нават паслухаць гутарак старажылаў, якія для чалавека звонку напаміналі б таемны код. Дзяды краналі неіснуючыя ўжо адрасы і месцы даваеннай пары са свежасцю быццам здарыліся яны ўчора. (— А памятаеш Яся, таго што з Германіі не вярнуўся. — Ля! Добра памятаю. У Яся знак на шчацэ быў! А яго сястра Паўліна за Гарбачыка пайшла. Таго, што ў тартакеві рабіў).**

— А ты адкуль тут узялася? — замест прывітання кінуў Ваня.

— А еду туды і туды... — я распавяла ўсё ў двух сказах. У тым часе я здзівілася, што сустрэча з Ванем ані грама мяне не здзіўляе. І што едзем у адно месца. Быццам дамовіліся. Праўда, дзень раней, мы гаварылі пра яго з Улянай Бондар. Мы разважалі ці хоць яшчэ жыве бядоцік. Ці не памёр ад голаду і нуды на сваім хутары „Воўчае горла"?

— Бяда ў мяне, — заявіў сумна Ваня, — кабыла здохла. Ужо трэці дзень ляжыць з адваленымі капытамі...

Вестка пра смерць жывіны сярпом скрыганула па вуху.

— За рэнтай еду, — дадаў, — каб пахаваць падлоху...

Ад шоку ў маёй ароматрэпнутай галоўцы з'явіліся дурныя думкі. Мне здалося, што Ванева кабыла ляжыць на яго версальцы ў вялікім пакоі пад ягоным здымкам-карцінай з войска (у мундзіры). Труп каня па галаву меў быць накрыты коўдрачкай. На ёй красавалася грыва заплеценая ў косы-дрэды. Апошняй справай паклапаціліся русалкі з недалёкага вадасховішча... Фэ! (Такі ўплыў апавяданняў Уляны Бондар, якая размножыла русалак у Семяноўскім моры ў сваіх „Гісторыях з фіялетавага свету"). Праз момант мне стала сорам за сябе і Уляну. Ідыёткі! Тут бяда, а ім хоць бы дзічкі. Кпяць і смяюцца з чалавечага гора. Праўда, Ваня не лепшы. Скажу больш, я эмацыйна злучаная з яго кабылай. Памятаю як у час першай сустрэчы ён пачаставаў мяне кампліментам: — А ў мяне кабыла з тваіх старон. Наравістая, халерачка! Праўдзівая падляшоха!

— А ты прачытаў „Гісторыі з фіялетавага свету"? — я спрабавала павярнуць ката хвастом, значыць, памяняць тэму. Восенню мінулага года мы з Улянай завіталі на ягоны хутар. Вані не было ў хаце. Мы грукалі ў дзверы і вокны аж кулакі апухлі. У канцы здаліся і аставілі „Гісторыі" на сходках ды накрылі іх чыгуном, што валяўся ля парога.

— Не чытаў, — адрэзаў ён са злосцю, — і не збіраюся іх чытаць. Я ведаю, што ў яе на ўме. (Ці не надакучылі мы яму тады грукатам?). Ваня не хацеў гаварыць пра прозу Уляны і таксама памяняў тэму, карацей, ён павярнуў размову зноў у бок дохлай кабылы.

— Вазьму рэнту, каб было за што хлопцам паставіць...

Спачатку мне падалося, што мова пра тую конскую трызну. Ваня прыкмеціў іронію. І ён таксама крыва ўсміхнуўся:

— Крызіс жа ж, — адзначыў ён, — на ўсім ашчаджаць трэба.

Я не разумела ходу думкі прыяцеля. Да гэтай пары ён аніяк не асацыяваўся мне з ашчаднасцю. А крызіс, наколькі памятаю, ніколі яго не мінаў і не пакідаў.

— Трэба выкапаць ямку, — цягнуў ён, — заваліць раз-раз. Каб смурод не пайшоў. А то яшчэ ліс прыбяжыць і курэй пабярэ...

На грунце смуроду і яго паслядоўнасцей мы аднадумцы. Ваню таксама не падабаўся пах каўбасы і мокрага пер'я ў аўтобусе.

— А чаму сам не закапаеш? — мяне таксама пацягнула ў бок ашчаднасцей.

— Бо рукі баляць, — у апраўданні сябры адчувалася нотка ляноты і наракання. І кпіны з маёй асобы. Таму я перастала гуляць у слоўцы і, як базарная баба, рубанула:

— А дупа хоць не баліць?

— Вядома, дупа таксама баліць, — пачуўся разважны адказ, — я ж сваё адсядзеў....

Наступныя тры прыпынкі мы не азваліся словам. Я спазірала на лес, у якім сінела мора пралесак. Ваня глядзеў у спіну пасажыра ў папярэднім радку. А... Чытачу варта ведаць, што мой субяседнік ніколі не сядзеў у турме, не працаваў у якасці стоража, камп'ютаршчыка...

Дзесьці ля Свінарояў ён пэнкнуў і зноў пачаў пра сваю кабылу:

— Каб яе афіцыйна закапаць, трэба больш за шэсцьсот злотых.

— Ты маеш на ўвазе паслугі пахавальнай фірмы?

— Яны непатрэбныя мне. Мая кабылка не страхаваная. Ніхто за яе шкуру кампенсацыі не выплаціць...

Пахавальнае прадпрыемства са спецыяльнасцю „хатняя жывёла" патрабавала за паслугу больш за месячную пенсію Вані.

— Бач, да чаго дажылі. На х... мне такая дэмакратыя!

Апошняя мудрасць родам з „Воўчага горла" закалола ў сэрца. Ваня не асобны ў сваёй палітычнай думцы. Ён стаў наракаць на бездапаможнасць, абыякавасць. Пасля параіў, каб адчапіцца ад яго рук і дупы. Ён ужо дамовіўся з хлопцамі з-пад магазіна. Пахаваюць за пяць бутляў гарэлкі.

— А за сем, — тут сябра загнуў фразу, — нават слана табе закапаюць.

Мы ехалі і думалі, каб яшчэ раз памяняць тэму. Ва ўсім няшчасці адчувалася нотка прыемнасці ад нечаканай сустрэчы. Ваня чуць-чуць акрыяў. Ён пачаў гаварыць пра тэлесерыялы, рэкламы, тэлетурніры... І рассалопіўся дурань! Ён сказаў, што за апошніх дзесяць дзён ні разок не быў на двары. Як гэта магчыма? Ляжаў сабе на версальцы як лорд і аглядаў тэлік... Усё як ляцела, па чарзе, ад світання да змяркання. А ўжо найлепшыя ў свеце маскоўскія тэлеканалы! Якія ў іх тэлетурніры, якія бабкі...

Ваня хваліў рускія тэлеканалы, а мне высвятлялася яшчэ адна праўда. Я бачыла як тады, калі Ваня касіў па польскіх, беларускіх, рускіх і ўкраінскіх тэлеканалах, у ягоным хляўку паміраў ад голаду і смагі кабылка. Пасля прыйшла горкая рэфлексія, ціснула сумленне. Я і Уляна — ідыёткі. Гэта мы ў пэўнай меры наварылі кашы. Справа ў чым? Раз мы наслухаліся нараканняў на хутары „Воўчае горла". У другі раз мы паперліся туды ў госці з марачным тэлевізарам. Якраз наш дарагі прыяцель святкаваў быў свой дзень нараджэння...

Каб усё было ясна. Ваня не дурны. Ён штось прадчуваў. Цягам трох гадоў наш тэлевізар стаяў сабе спакаваны ў кутку. На гэтую акалічнасць нібыта мела спрацаваць тэхнічная дэбільнасць сябры. Ён казаў, што спачатку не ведаў як падключыць антэну. А нядаўна, калі пасля трох гадоў даведаўся, адразу страціў кабылу!

Такія гісторыі з фіялетавага свету. Мы сышлі з аўтобуса і яшчэ доўга не маглі развітацца. Гора і пачуццё віны аб'яднала нас.

## 03.05 — 09.05

**(22.03. — 20.04.)** Сваёй красой, мілымі паводзінамі і баявітасцю ачаруеш кожнага. Без праблем атрымаеш дамапогу і зрэалізуеш свае мэты. Знойдзеш братнюю душу. Твае стараннi за павышэнне з 9.05. могуць быць успрыняты як нахабства.

**(21.04. — 21.05.)** Хтось падступна намовіць цябе выказацца за неадпаведным бокам. Калі чакаюць цябе судовыя справы наконт спадчыны, вырашэнне можа быць некарыснае. Недахоп самаўпэўненасці захочаш схаваць за жорсткасцю. У каханні прымяняй метад „праз страўнік у сэрца".

**(22.05. — 22.06.)** Лёгкасць, добры настрой (уся палова месяца). Будзеш квітнець у кампаніі, ззяць інтэлігентнасцю. Адчуеш, што прыйшоў твой час, што маеш шанц зрэалізаваць свае мары. Але захочацца пабыць у адзіноце.

**(23.06. — 23.07.)** Сябры заахвоцяць цябе да развою, падтрымаюць усе твае праекты. Не праваронь паяўляючыхся шанцаў! У час поўні Месяца (9 мая) не адкідвай залётаў былога кахання, асабліва калі было яно няздзейсненым (толькі цяпер маеце шанц аднавіць сувязь). З 9.05. варожая асоба, зайздросная за твае поспехі, адкрыта выступіць супраць цябе.

**(24.07. — 23.08.)** 3-7.05. маеш шанц правесці важныя фінансавыя аперацыі і наладзіць сумленныя бізнесовыя дамовы. Калі ты замужам ці жанаты, перажывеш залаты час у сваім сужонстве. Можаш таксама заашчадзіць ладны капітал на „чорную гадзіну".

**(24.08. — 23.09.)** Так кар'ера, як і стан фінансаў будуць залежаць ад тваёй адукацыі. Варта інвеставаць у сябе, здабываць дыпломы, сертыфікаты, ліцэнзіі. Карыснымі будуць замежныя паездкі. Толькі ж надта будзеш зайздросны за партнёра!

**(24.09. — 23.10.)** Будзеш спрытны, інтэлігентны, улаўліваючы настрой атачэння. Але і зразумееш, што галавой муру не праб'еш. Не паддавайся ніякім націскам. У фінансах пазбягай рызыкі, бо шмат можаш страціць.

**(24.10. — 22.11.)** Магчымыя фінансавыя праблемы. Старайся не спадзявацца на зашмат ад кагосьці, хто па-за красой і мілымі словамі не мае нічога ў прапанове. Поўня Месяца ў тваім знаку (8-10.05.) — зваротны пункт, момант крызісу і няўпэўненасці. Дзве першыя дэкады мая — ненайлепшая фізічная форма, благія прыкметы могуць быць знакам чагосьці больш сур'ёзнага — адразу бяжы да доктара!

**(23.11. — 22.12.)** Першая палова мая — ухаластую. Мала будзе здарацца, што не значыць, што не пойдзеш уперад. Поўня Месяца вызначыць час, калі найлепш палічыцца са справамі, што ляжаць табе на сэрцы. Добры час на ўнутраныя парадкі. Блізкая асоба здзейсніць твае скрытыя мары.

**(23.12. — 20.01.)** Будзеш больш адказны, спраўны, сарганізаваны. Поспехі выніклыя з ранейшага. Партнёр можа расчараваць цябе нястрымліваннем абяцанага.

**(21.01. — 19.02.)** У час поўні Месяца нічога не абяцай, не вырашай аб сваёй прафесійнай будучыні. Пачакай, каб сітуацыя выкрышталізавалася. Дзеля парадку ў пары будзеш прымушаны адмовіцца ад некаторых сваіх патрэб. Не выдавай незаробленага.

**(20.02. — 21.03.)** Пазнаёмішся з цікавымі людзьмі, вырашыш з кім сустракацца, а каго абмінаць. Задбаеш пра свае патрэбы, не дасі ўзлазіць сабе на галаву. У пачуццёвых справах галоўную ролю адыграюць шчырасць і непасрэднасць. Будзеш дзейсны, спраўны, даб'ешся сімпатыі атачэння.

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

ISSN 0546-1960